# СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

5 лютага 2022 года, № 1–2 (2252–2253)



# БДУ – стогадовая гісторыя поспеху!

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з'яўляецца інавацыйным універсітэтам з перадавымі тэхналогіямі і методыкамі навучання, шматтысячнай карпарацыяй прафесіяналаў, аўтарытэтных навукоўцаў і найлепшых выкладчыкаў**




### 1. Міжнародны аўтарытэт

БДУ ўвайшоў у лік топавых універсітэтаў – 1 % найлепшых ВНУ свету (293-е месца па версіі агенцтва QS). У сусветным рэйтынгу працаўладкавання выпускнікоў БДУ знаходзіцца ў групе з месцамі 251-300.

### 2. Лічбавы ўніверсітэт

У БДУ функцыянуе найбуйнейшы ў краіне Адукацыйны партал з выкарыстаннем электронных сродкаў навучання. Ён абслугоўвае 7800 навучальных дысцыплін з колькасцю карыстальнікаў 25000 чалавек, што ў сярэднім па факультэтах складае 88 %.



### 3. Поўны цыкл «навучанне – навука – вытворчасць»

БДУ ажыццяўляе інтэграцыю навучальна-навукова-вытворчых працэсаў і садзейнічае камерцыялізацыі тэхналагічнай прадукцыі. 70 праектных каманд прайшлі акселерацыю на базе стартап-цэнтра.





### 4. Прызнаныя выкладчыкі

У БДУ працуюць 210 дактароў навук і прафесараў. Больш за 50 % навукова-педагагічных кадраў маюць вучоныя ступені.

### 5. Таленавітыя студэнты.

У нас навучаецца кожны трэці студэнт з рэспубліканскага банка даных адоранай моладзі, а таксама кожны пяты аспірант краіны.



# Біялагічны факультэт

Дэкан – доктар біялагічных навук прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Вадзім Віктаравіч ДЗЯМІДЧЫК

Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 10

Тэл. 209-58-08, 209-59-02

E-mail: bio@bsu.by

www.bio.bsu.by







## Біялагічны факультэт – самы вялікі сярод прыродазнаўчых факультэтаў

У структуры факультэта: 9 кафедраў, 9 навукова-даследчых лабараторый, заалагічны музей, батанічны сад, гербарый, вучэбна-навуковы цэнтр «Нарачанская біялагічная станцыя імя Г. Г. Вінберга».

Функцыянуюць 9 філіялаў кафедраў на базе НАН Беларусі, прыродаахоўных установаў і прамысловых прадпрыемстваў.

Працуюць 3 акадэмікі, 3 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 19 дактароў і 85 кандыдатаў навук.

Навучаюцца каля 1800 студэнтаў, 35 магістрантаў і 50 аспірантаў, у тым ліку замежнікі з Эквадора, Кітая, Ірака, Казахстана, Туркменістана, Расіі і Украіны.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

- **«Біялогія»** (напрамкі: «навукова-вытворчая дзейнасць», «навукова-педагагічная дзейнасць» і «біятэхналогія»),
- **«Біяэкалогія»,**
- **«Біяінжынерыя і біяінфарматыка»,**
- **«Біяхімія»,**
- **«Мікрабіялогія».**

Студэнты атрымліваюць адну з 7 кваліфікацый: *«Біёлаг»*, *«Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі»*, *«Біёлаг-біятэхнолаг. Выкладчык біялогіі»*, *«Біяінжынер-біяінфарматык»*, *«Біёлаг-эколаг. Выкладчык біялогіі і экалогіі»*, *«Біёлаг. Біяхімік»* і *«Біёлаг. Мікрабіёлаг»*. На завочным аддзяленні падрыхтоўка вядзецца па спецыяльнасцях «Біялогія» (напрамкі: «навукова-вытворчая дзейнасць» і «навукова-педагагічная дзейнасць»), «Біяэкалогія», «Біяхімія» і «Мікрабіялогія».

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Дзейнічаюць 9 студэнцкіх навуковых гурткоў, чатыры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі: малекулярнай біятэхналогіі; прыкладных праблем раслінней клеткі і біятэхналогіі раслін; структуры і дынамікі біяразнастайнасці; біяінфарматыкі і малекулярнай эвалюцыі жывёл.

Пры гэтым студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі структуры і дынамікі біяразнастайнасці і біяінфарматыкі і малекулярнай эвалюцыі жывёл з'яўляюцца аднымі з самых высакарэйтынгавых ва ўніверсітэце.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі факультэта могуць працаваць супрацоўнікамі навукова-даследчых інстытутаў, на прадпрыемствах фармацэўтычнай, біяхімічнай, мікрабіялагічнай, ветэрынарнай і харчовай прамысловасці, аграпрамысловага комплексу, на прадпрыемствах, якія вырабляюць касметыку, у кампаніях, якія распрацоўваюць праграмнае забеспячэнне для аналізу біялагічных сістэм, у экспертна-крыміналістычных цэнтрах, у запаведніках, заказніках, нацыянальных парках, батанічных садах, на селекцыйных станцыях, ва ўстановах Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у сістэме Дзяржкамгідрамета, у сертыфікацыйных, экспертна-аналітычных, мытных установах, выкладчыкамі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў і г. д.

**125** усяго выкладчыкаў
**1800** студэнтаў
**3** акадэмікі
**3** члены-карэспандэнты
**19** дактароў
**85** кандыдатаў навук

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Штогод супрацоўнікамі факультэта выконваецца каля 100 навукова-даследчых праектаў, з якіх вялікая колькасць з'яўляецца гаспадарчымі дамовамі. Ажыццяўляюць даследаванні ў межах усіх праектаў таксама і студэнты, многія на платнай аснове. У бягучым годзе факультэт удзельнічае ў выкананні 2 міжнародных кантрактаў.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Дзейнічаюць творчыя аб'яднанні: «Біятэатр», газета Vita і іншыя. Штогод маштабна праводзяцца два святы – пасвячэнне першакурснікаў у студэнты і дні біёлага. На біяфаку гэта не толькі мерапрыемствы для студэнтаў і выкладчыкаў, але і час традыцыйных сустрэч выпускнікоў факультэта. Падрыхтоўкай святочных праграм займаецца «Біятэатр» – саюз творчых людзей, якія імкнуцца зрабіць больш разнастайным і вясёлым жыццё на факультэце. Кожная пастаўленая «Біятэатрам» п'еса арыгінальная і ставіцца на сцэне толькі адзін раз, і гэта таксама непарушная традыцыя.

### ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

На факультэце з 2011 г. працуе «Школа юнага біёлага». Слухачамі могуць стаць вучні 9–11 класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. Праграма навучання разлічана на 2 гады і накіравана на паглыбленае вывучэнне біялогіі.

**Біяфак – гэта рамантыка зносін з прыродай!**
**Біяфак – гэта любоў да ўсяго жывога!**



## Водгукі выпускнікоў



**Алена ЛІТВІНАВА, начальнік упраўлення інавацыйнага развіцця РУП «Белмедпрэпараты», кандыдат біялагічных навук. Выпускніца 1989 г.**

– Не магу сказаць, што ў дзяцінстве і юнацтве марыла стаць біёлагам, хоць вельмі любіла прыроду. Прыцягвала прафесія ўрача, хіміка, педагога. Выбар на карысць біялогіі быў заснаваны, хутчэй, на сямейнай традыцыі: бацькі скончылі біялагічны факультэт БДУ і заставаліся адданымі атрыманай прафесіі ўсё жыццё.

Але я ўвогуле не шкадую пра свой выбар! Бо, стаўшы біёлагам, я адначасова стала і хімікам, і педагогам, і нават трохі ўрачом. І нічога дзіўнага ў гэтым няма, бо праграма навучання на факультэце ўключае вялікую колькасць спецыяльных і дадатковых дысцыплін, вывучэнне якіх спрыяе фарміраванню не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў, але і ўсебакова развітых асоб.

Воляю лёсу пасля працы на факультэце я патрапіла ў рэальны сектар эканомікі – на РУП «Белмедпрэпараты». Зараз узначальваю ўпраўленне інавацыйнага развіцця. Здавалася б, якая сувязь фармацэўтыкі з біялогіяй? Самая непасрэдная!

Біялагічная адукацыя дазваляе рэалізаваць сябе і ў гэтай сферы, у прыватнасці, пры вызначэнні падыходаў да распрацоўкі біялагічных і хімічных метадаў кантролю якасці лекаў, да тэхналогій атрымання біялагічна актыўных злучэнняў і прэпаратаў на іх аснове з выкарыстаннем біятэхналагічных працэсаў. А гэтыя веды – вынік навучання на біялагічным факультэце!

Жадаю ўсім здароўя і дабрабыту, а роднаму біяфаку – росквіту!



**Іна ЛЕРМАНТАВА, загадчыца лабараторыі ў Інстытуце генетыкі культурных раслін, Гатэрслебен, Германія. Кандыдат біялагічных навук. Выпускніца 1994 г.**

– Пяць гадоў вучобы на біяфаку былі вельмі цікавымі і насычанымі. Усіх нашых выкладчыкаў я заўсёды буду ўспамінаць з падзякай, а некаторыя з іх сталі для мяне арыенцірам, да якога я імкнуся ў сваім прафесійным жыцці.

Адразу пасля ўніверсітэта я з'ехала ў аспірантуру ў Германію. І калі практычных навыкаў мне часам бракавала, то выдатная тэарэтычная падрыхтоўка, атрыманая на факультэце, заўсёды была маім моцным бокам, таму новыя методыкі было нескладана асвойваць.

У Германіі я абараніла дысертацыю, апублікавала шмат навуковых прац, стварыла сваю лабараторыю. Ад студзеня 2020 года ў мяне стажыруецца выпускніца кафедры мікрабіялогіі Марыя Ратнікава.

На яе прыкладзе я ўбачыла, што ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі выпускнікоў біяфака застаўся на вышыні і нічым не саступае іншым еўрапейскім універсітэтам, а ўзровень практычных навыкаў значна палепшыўся.

Так трымаць, дарагія выкладчыкі і студэнты!

# Ваенны факультэт










Начальнік – палкоўнік Аляксандр Іосіфавіч ЮНЕЦ

Адрас: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4

Тэл. 209-52-83

E-mail: bsu@mod.mil.by

www.bsu.by

**36** усяго выкладчыкаў

**159** курсантаў

**2** кандыдаты навук

**9** старшых выкладчыкаў

Ваенны факультэт БДУ двойчы запар прызнаваўся найлепшым сярод профільных факультэтаў установ вышэйшай адукацыі. Мы рыхтуем кадравых афіцэраў на найвышэйшым узроўні!

Факультэт пачынаўся з ваеннай кафедры БДУ, утворанай 4 лістапада 1926 г. У 1926–1931 гадах тут выкладаў будучы чатырохразовы Герой Савецкага Саюза, Маршал Савецкага Саюза Георгій Жукаў, які служыў у той час у Беларускай ваеннай акрузе. Таксама на ваеннай кафедры БДУ праходзілі ў свой час службу Героі Савецкага Саюза генерал-маёр Аляксандр Кірсанаў і палкоўнік Аляксей Патрын.

За перыяд да 2003 г. ваенная кафедра выпусціла тысячы афіцэраў запасу па 13 ваенна-ўліковых спецыяльнасцях. У 2003 г. кафедра была рэарганізавана ў ваенны факультэт БДУ.

У цяперашні час ваенны факультэт БДУ ўключае ў сябе: кафедру баявога прымянення артылерыі; кафедру супрацьпаветранай абароны; агульнавайсковую кафедру; кафедру радыяцыйнай, хімічнай, біялагічнай абароны.

**ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ**

Ваенны факультэт ажыццяўляе падрыхтоўку ваенных кадраў для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, органаў памежнай службы Дзяржаўнага памежнага камітэта, Камітэта дзяржаўнай бяспекі і ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**НАВУЧАННЕ**

Падрыхтоўка студэнтаў вядзецца па праграмах афіцэраў запасу і па праграмах малодшых вайсковых спецыялістаў.

Падчас навучання курсанты і студэнты выконваюць практыкаванні стральбы са стралковай зброі, сродкаў узбраення БМП, а таксама па кіраванні баявой тэхнікай.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

- **«Хімія»**, напрамак: радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона (кваліфікацыя *«Спецыяліст па кіраванні. Хімік-эколаг»*);
- **«Правазнаўства»**, спецыялізацыя: юрысконсультацкая работа ў ваеннай сферы (кваліфікацыя *«Юрыст»*);
- **«Геаінфармацыйныя сістэмы»**, напрамак: спецыяльныя (кваліфікацыя *«Спецыяліст па геаінфармацыйных сістэмах»*);
- **«Прыкладная крыптаграфія»** (кваліфікацыя *«Матэматык. Спецыяліст па абароне інфармацыі»*);
- **«Міжнародныя адносіны»**, спецыялізацыя: міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы (кваліфікацыя *«Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моў зносін)»*); спецыялізацыя: міжнародныя адносіны ў інфармацыйнай сферы (кваліфікацыя *«Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моў зносін)»*).

На ўсіх спецыяльнасцях факультэта вывучаюцца агульнапрафесійныя дысцыпліны адпаведных грамадзянскіх спецыяльнасцяў, а таксама ваенная тапаграфія, ваенна-інжынерная падрыхтоўка, агульная тактыка, агнявая падрыхтоўка, асновы ваеннага заканадаўства, радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона, агульнавайсковыя статуты, страявая падрыхтоўка, кіраванне і сродкі сувязі.

Форма атрымання адукацыі на ваенным факультэце – дзённая.

**ПАСТУПЛЕННЕ**

На ваенны факультэт маюць права паступаць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь:

– ва ўзросце ад 17 да 21 года, у тым ліку тыя, якія дасягнуць 17-гадовага ўзросту ці дасягнулі 21-гадовага ўзросту ў год паступлення на вучобу;

– якія прайшлі ці праходзяць тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, якія прайшлі ваенную службу па кантракце, – не старэйшыя за 23 гады;

– ваеннаслужачыя, што праходзяць ваенную службу па кантракце, – не старэйшыя за 25 гадоў.

Абітурыенты ва ўзросце да 18 гадоў акрамя дакументаў, неабходных для паступлення на ваенны факультэт у БДУ, дадаткова ў абавязковым парадку прадстаўляюць пісьмовую згоду з умовамі кантракта бацькоў або законнага прадстаўніка.

Тэрмін навучання па спецыяльнасцях:

хімія, правазнаўства, геаінфармацыйныя сістэмы, міжнародныя адносіны – 4 гады;

прыкладная крыптаграфія – 5 гадоў.

**ПРАЖЫВАННЕ І ВОЛЬНЫ ЧАС**

Пражыванне курсантаў на ваенным факультэце арганізавана ў добраўпарадкаваным інтэрнаце. Два разы на год (узімку і ўлетку) курсантам даецца адпачынак працягласцю да 14 і 30 сутак адпаведна.

Вялікая ўвага надаецца і фізічнай падрыхтоўцы. Для курсантаў прадстаўлена добрая спартыўная база. Курсанты могуць карыстацца трэнажорнымі заламі, басейнам, стадыёнам. Працуюць шматлікія секцыі, рэгулярна праводзяцца спартыўныя спаборніцтвы.

Ваенны факультэт займаецца не толькі падрыхтоўкай высакакласных спецыялістаў, але і дае магчымасць курсантам праявіць сябе ў грамадскім жыцці.

Веды, якія атрымліваюць будучыя афіцэры, робяць з выпускнікоў выключных спецыялістаў у сваёй галіне. Гэта пацвярджае і дыплом вядучай ВНУ нашай краіны.

**Выпускнікоў ваеннага факультэта БДУ чакаюць пярвічныя пасады афіцэрскага складу ў сілавых структурах забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.**

## Водгукі выпускнікоў



**Ян ДЗЯШЧЭНЯ, курсант 4 курса, спецыяльнасць «Міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы».**

– Калі перада мной стаў выбар, кім быць, я ведаў, што стану ваенным міжнароднікам. Мне заўсёды падабалася вучыць замежныя мовы, а ў ваенна-патрыятычным класе я зразумеў, што абараняць Радзіму – гэта не толькі прэстыжна, але і цікава.

Вучоба на ваенным факультэце адкрыла для мяне новы свет і дала мне вельмі многае. У першую чаргу знаёмства з найлепшымі людзьмі нашай краіны. За час навучання тут я прымаў удзел у спартыўных, навуковых і культурных мерапрыемствах, што дазволіла мне пазнаёміцца з людзьмі з розных сфер. Складана знайсці месца з такой канцэнтрацыяй разумных, цікавых і таленавітых людзей, як БДУ.



**Дзяніс ЧАРТКОЎ, курсант 4 курса, спецыяльнасць «Міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы».**

– Афіцэр – гэта не прафесія, гэта пакліканне, стан душы. Не кожны здольны звязаць сваё жыццё з войскам, для гэтага неабходныя асаблівыя якасці, як фізічныя, так і маральныя. Быць афіцэрам прэстыжна, але і вельмі цяжка. Бо трэба быць не толькі пісьменным і спартыўным, а яшчэ трэба любіць людзей, умець абараняць іх і сваю краіну, быць патрыётам. Людзі ў вайсковай форме здаўна ўвасаблялі найлепшыя рысы нашага народа, гонар, высакароднасць! Менавіта таму я вырашыў звязаць сваё жыццё з ваеннай справай, паступіўшы ў вядучую ВНУ краіны – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Навучанне тут было прэстыжным ва ўсе часы, а вывучаць навуку перамагаць на ваенным факультэце ў БДУ ўдвая больш ганарова.

# Гістарычны факультэт

Дэкан – доктар гістарычных навук прафесар Аляксандр Генадзьевіч КАХАНОЎСКІ

Адрас: г. Мінск, вул. Мендзялеева, 36.

Тэл. 360-09-14

E-mail: hist@bsu.by

www.hist.bsu.by









## Гістарычны факультэт – гэта традыцыі і інавацыі, паглыбленне ў мінулае нашай Радзімы і ўпэўнены крок у будучыню.

У склад уваходзяць: 9 кафедраў, вучэбная лабараторыя музейнай справы, якая ўключае археалагічную і этнаграфічную калекцыі і калекцыю антычнага мастацтва. Нумізматычны кабінет гістарычнага факультэта – адзіны сярод універсітэцкіх збораў у СНД і адзін з найбагацейшых у Еўропе.

Праграмы першай ступені вышэйшай адукацыі асвойваюць 822 студэнты (у тым ліку 518 студэнтаў дзённай формы навучання і 304 студэнты завочнай формы навучання). Па праграмах другой ступені вышэйшай адукацыі навучаюцца 54 магістранты, у аспірантуры і дактарантуры – 105 чалавек.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

- **Гісторыя.** Напрамкі: айчынная і ўсеагульная гісторыя, паліталогія, археалогія, гісторыя мастацтваў, гісторыя міжнародных зносін, гісторыя рэлігіі і гістарычная інфарматыка;
- **Рэгіёназнаўства;**
- **Гісторыка-архівазнаўства;**
- **Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны.** Напрамкі: гісторыя і музеалогія, мастацтвазнаўства і музеалогія, культурная спадчына і турызм;
- **Дакументазнаўства.** Напрамкі: дакументацыйнае забеспячэнне кіравання, інфармацыйнае забеспячэнне кіравання.

### ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЕ НАВУЧАННЕ

Гістарычны факультэт актыўна ўзаемадзейнічае з органамі дзяржаўнага кіравання, школамі і гімназіямі, музейнымі, архіўнымі і турыстычнымі ўстановамі. Сярод іх Дэпартамент па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь і інш. На іх базе праводзяцца навучальныя і вытворчыя практыкі, вядзецца прафарыентацыйная праца, створаны чатыры філіялы кафедраў.

### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Гістарычны факультэт падтрымлівае цесныя сувязі з гістарычнымі факультэтамі універсітэтаў Расіі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Латвіі, Літвы, Германіі, Англіі, Кітая і інш. Студэнты стажыруюцца ў МДУ імя М. В. Ламаносава, Латвійскім універсітэце Рыгі, універсітэце Брно, універсітэце Пльзеня, універсітэце Брэмена, універсітэце Цюбінгена, універсітэце Кента і шэрагу іншых. Праводзяцца міжнародны расійска-беларускі конкурс студэнцкіх навуковых прац па гісторыі (сумесна з МДУ імя М. В. Ламаносава), студэнцкі конкурс сумесна з Уроцлаўскім універсітэтам. Студэнты другой ступені атрымання вышэйшай адукацыі навучаюцца ў сумеснай магістратуры БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава. Студэнты выязджаюць на археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Польшчы. Арганізоўваюцца экскурсійныя паездкі для знаёмства з культурай суседніх краін (Расія, Літва, Польшча, Украіна, Латвія).

**1800** студэнтаў
**125** усяго выкладчыкаў
**3** акадэмікі
**3** члены-карэспандэнты
**19** дактароў
**85** кандыдатаў навук

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Больш за 50 % студэнтаў займаюцца даследчай працай, бяруць удзел у міжнародных, рэспубліканскіх, універсітэцкіх канферэнцыях. Пры кафедрах дзейнічаюць 2 студэнцкія лабараторыі і 11 навуковых гурткоў. Праводзяцца віктарыны, конкурсы і іншыя мерапрыемствы па пытаннях папулярызацыі гісторыка-культурнай, духоўнай спадчыны і дасягненняў Беларусі.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

У 2020 г. усе выпускнікі бюджэтнікі гістарычнага факультэта былі забяспечаны першым працоўным месцам.

Выпускнікі спецыяльнасці «Гісторыя (па напрамках)» былі размеркаваны: 56 % ва ўстановы адукацыі, 23 % у БДУ, 19 % у музеі і архівы, 2 % у органы МУС і вайсковыя часткі. Выпускнікі спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)» былі размеркаваны: 76 % ва ўстановы адукацыі, 5 % у БДУ, 15 % у музеі і архівы, 4 % у органы МУС і вайсковыя часткі. Выпускнікі спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)» былі размеркаваны: 22 % у музеі, 78 % ва ўстановы адукацыі. Выпускнікі спецыяльнасці «Дакументазнаўства (па напрамках)» былі размеркаваны: 80 % у Міністэрства юстыцыі, 20 % ва ўстановы адукацыі. Выпускнікі спецыяльнасці «Гісторыка-архівазнаўства» былі размеркаваны: 38 % у архівы, 39 % ва ўстановы адукацыі, 23 % у дзяржаўныя ўстановы.

### ПРАКТЫКІ

Па завяршэнні першай летняй сесіі студэнты выязджаюць на археалагічную і этнаграфічную практыку. Шматлікія знаходкі, якія характарызуюць розныя аспекты і перыяды гісторыі Беларусі, папаўняюць калекцыі музейнага збору факультэта і прадстаўлены ў экспазіцыі навучальнай лабараторыі. Праграмы падрыхтоўкі спецыялістаў уключаюць таксама інфармацыйную, эўрыстычную, музейную (экскурсійна-фондавую), дакументазнаўчую, педагагічную, палеаграфічную, архіўную, архіўна-справаводную практыкі.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Студэнцкія арганізацыі факультэта рэалізуюць розныя моладзевыя праекты, каб прыўнесці штосьці новае, нестандартнае, «крэатыўнае» ў жыццё. У штогадовых мерапрыемствах «Турзлёт у Анусіне», «Капуснік», «Хвіліна славы», «Містар гістфака», «Міс гістфака», «Дзень гістарычнага факультэта», «Дні айчыннай гісторыі» і іншых бярэ ўдзел вялікая колькасць студэнтаў усіх курсаў. Выпускаецца студэнцкая газета «Ніка». Дзейнічаюць творчыя і спартыўныя аб'яднанні студэнтаў, інтэлектуальныя «Дэбатклуб» і «Што? Дзе? Калі?». Рэалізуюцца моладзевыя праекты «Памяць і слава», «Дыялог культур і рэлігій», «Памяць жыве ў пакаленнях».

## Водгукі выпускнікоў



**Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь. Выпускнік 2004 г.**

– Гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, на якім я навучаўся з 1999 па 2004 гг., гэта не проста адукацыя і кваліфікацыя, якую я атрымаў па завяршэнні навучання. У першую чаргу гэта вельмі моцная база фундаментальных ведаў, якая на практыцы ў маім жыцці, у маёй кар'еры і прафесіі спатрэбілася. З асноў, якія даў гістарычны факультэт, гэта фарміраванне агульнага светапогляду, разуменне сутнасці як прафесійных, так і палітычных працэсаў.



**Наталля ШАСЦІЛОЎСКАЯ, начальнік упраўлення справаводства Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Выпускніца 2009 г.**

– Універсітэт дапамог мне стаць самадастатковым чалавекам, заняць актыўную жыццёвую пазіцыю і самавызначыцца.
Ён спрыяў майму кар'ернаму росту, стаў для мяне адным з элементаў падрыхтоўкі да маёй будучыні.
Важныя складнікі ў адукацыі – рэальныя праекты і стартапы. Я атрымала навыкі міжгаліновай камунікацыі, кіравання праектамі і працэсамі, навучылася працаваць з калектывамі і асобнымі людзьмі, размяркоўваць рэсурсы і час.
Адзін з самых галоўных набыткаў за гады вучобы – сацыяльныя сувязі.
Універсітэт сфарміраваў жаданне не спыняцца на дасягнутым, удасканальвацца і вучыцца далей.

# Механіка-матэматычны факультэт











Дэкан – доктар фізіка-матэматычных навук дацэнт Сяргей Міхайлавіч БАСЯКОЎ

Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4

Тэл. 209-50-46, 209-52-49

E-mail: dekanat_mmf@bsu.by

www.mmf.bsu.by

## Мехмат вучыць думаць, аналізаваць, прымаць рашэнні

У структуры факультэта 10 кафедраў, навукова-даследчая лабараторыя прыкладной механікі, цэнтр адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій, 4 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Тут працуюць 3 акадэмікі НАН Беларусі, больш за 25 дактароў навук і прафесараў, 65 кандыдатаў навук і дацэнтаў. Навучаюцца звыш 1000 студэнтаў, 65 магістрантаў, 3 дактаранты і 35 аспірантаў.

**1072** студэнты

**118** усяго выкладчыкаў
**3** акадэмікі
**1** член-карэспандэнт
**26** дактароў
**68** кандыдатаў навук

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

- **«Механіка і матэматычнае мадэляванне»**

У рамках спецыяльнасці вядзецца падрыхтоўка па розных напрамках класічнай і сучаснай механікі і выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у механіцы. Студэнты асвойваюць такія навучальныя дысцыпліны, як «Дынаміка робатаў і маніпулятараў», «Сучасныя робаты», «Камп'ютарная механіка», «Біямеханіка» і «Мехатроніка».

Выпускнікі могуць працаваць у навукова-даследчых установах; канструктарскіх і праектных арганізацыях; ва ўстановах і арганізацыях, якія вядуць распрацоўкі ў галіне IT-тэхналогій, а таксама займаюцца мадэляваннем (матэматычным і камп'ютарным) механічных працэсаў і сістэм. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Механік. Матэматык-прыкладнік»*.

- **«Матэматыка (па напрамках)»**

Падрыхтоўка адбываецца па асобных навучальных планах у адпаведнасці з сённяшнімі патрабаваннямі і з вывучэннем фундаментальных матэматычных дысцыплін.

Выпускнікам навукова-вытворчага напрамку даецца кваліфікацыя *«Матэматык»*. Яны працуюць у НДІ, канструктарскіх бюро, інфармацыйных цэнтрах, на прадпрыемствах, у банках і інш.

Студэнты навукова-педагагічнага напрамку атрымліваюць кваліфікацыю *«Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі»*.

- **«Камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз»**

Выпускнікі спецыяльнасці «Камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз» з'яўляюцца спецыялістамі па распрацоўцы, стварэнні і суправаджэнні інфармацыйных сістэм любога ўзроўню; распрацоўцы і выкарыстанні матэматычных метадаў апрацоўкі, назапашвання, надзейнасці захоўвання, перадачы і забеспячэння абароны інфармацыі. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Сістэмны аналітык»*.

- **«Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі (па напрамках)»**

На спецыяльнасць «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі» набор праходзіць па двух напрамках: «Вэб-праграмаванне і інтэрнэт-тэхналогіі» і «Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне мабільных прылад».

У рамках гэтых напрамкаў студэнты вывучаюць курсы па асноўных мовах праграмавання, Python, Java і NET-тэхналогіях, тэхналогіях праектавання і працы з базамі даных, камп'ютарнай бяспецы і абароне інфармацыі.Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Спецыяліст па інфармацыйных тэхналогіях»*.

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ І РАЗМЕРКАВАННЕ

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца ў цеснай сувязі з навуковымі даследчымі і вытворчымі арганізацыямі, шматлікія з якіх з'яўляюцца базавымі партнёрамі факультэта. Нашы выпускнікі паспяхова працуюць у такіх арганізацыях, як: «Эксадэл», «Ітранзішн», «ЭПАМ Сістэмз», «Хайква Сaлюшанс», «К'юлікс Сістэмс», «Белхард Груп», VPI Systems, «Тэхнабанк», «Беларусбанк», «Мінскі аўтамабільны завод», «СКЭНД», «Атлант», «Інтэграл», «Міжнародны дзелавы альянс», «Белаграпрамбанк», «Беларуськалій», «АГАТ-сістэмы кіравання», Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, «Белгархімпрам» і інш.

### МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Разам з Універсітэтам Магдэбурга (Германія) рэалізуецца сумесная праграма падрыхтоўкі магістраў па спецыяльнасці «Камп'ютарная матэматыка».

Рэалізуецца праграма навучання ў сумесным інстытуце Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – Далянскі політэхнічны ўніверсітэт (Кітай) па спецыяльнасці «Механіка і матэматычнае мадэляванне» з магчымасцю атрымання дыпломаў двух універсітэтаў.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

На факультэце дзейнічаюць 4 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі:
- «Трыбафатыка»;
- «Лагічнае праектаванне прылад вылічальнай тэхнікі»;
- Міжкафедральная лабараторыя «Дыскрэтныя структуры і алгарытмы»;
- Міждысцыплінарная лабараторыя «Дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі».

### КАРПАРАТЫЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Студэнты мехмата паспяхова выступаюць у «Капусніку БДУ»: 1-е месца ў 2016 г., 3-е месца ў 2017 г. і зноў 1-е месца ў 2018 г. Дні механіка-матэматычнага факультэта з удзелам выпускнікоў розных гадоў дэманструюць невычарпальную фантазію і творчыя здольнасці студэнтаў. У красавіку 2018 г. факультэт святкаваў сваё 60-годдзе!

## Водгукі выпускнікоў



**Максім МІХАЛЁЎ, заснавальнік кампаніі ARTOX. Выпускнік 2006 года.**

– Мехмат вучыць думаць, аналізаваць, прымаць рашэнні – гэта тыя фундаментальныя навыкі, якія дазваляюць развівацца і разбірацца ў самых розных сферах. Мой выпуск прыйшоўся на час станаўлення IT-індустрыі ў краіне. Мы адчувалі, што сталі вельмі разумнымі, але кожны сутыкнуўся з праблемай, дзе ўжыць свае веды. Мяне ўніверсітэт звёў з самымі лепшымі сябрамі, і разам мы адкрылі IT-кампанію, у якой праз тры гады працавалі ўжо больш за 100 чалавек. Выпускнікі мехмата з пазіцыі стажораў за год выраслі па кар'ернай лесвіцы да кіраўнікоў аддзелаў. База, якую нам даў мехмат, дазволіла вельмі хутка дамагчыся поспеху і ў зусім іншых галінах.

Я вельмі рады таму, як развіваецца IT-індустрыя. На рынку з'явіліся кампаніі, якія займаюцца камп'ютарным праектаваннем, робататэхнікай. Гэта адкрывае новыя бліскучыя перспектывы для выпускнікоў нашага факультэта.



**Аляксандр МАШЭНСКІ, генеральны дырэктар СП «Санта Імпэкс Брэст». Выпускнік 1992 года.**

– Вызначальным для мяне пры паступленні на механіка-матэматычны факультэт стала тое, што мяне будуць вучыць высокапрафесійныя выкладчыкі. У мяне не было сумневаў у тым, што я атрымаю якасную адукацыю.

Мне сапраўды пашанцавала, што гады вучобы прайшлі менавіта тут, дзе базавыя дысцыпліны, спорт і зносіны даюць магчымасць фарміраваць сябе не толькі як прафесіянала, а таксама як асобу.

Тыя навыкі, якія я атрымаў падчас вучобы, дапамаглі мне дасягнуць поспехаў у тым, чым я займаюся цяпер.

У сваім жыцці я сустракаю вялікую колькасць паспяховых людзей, моцных кіраўнікоў, выбітных лідараў, прычым мяне асабліва цешыць тое, што сярод іх значную частку складаюць выпускнікі мехмата БДУ.

# Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі

Дэкан – кандыдат геаграфічных навук дацэнт Дзмітрый Міраслававіч КУРЛОВІЧ

Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16

Тэл. 209-52-57

E-mail: geo@bsu.by

www.geo.bsu.by





## Геафак – гэта экспедыцыі, вандраванні і адкрыцці, даследаванне нетраў Зямлі і геаінфармацыйных тэхналогій

Дзейнічаюць 7 кафедраў; 2 навукова-даследчыя лабараторыі; геастанцыя «Заходняя Бярэзіна»; музей землязнаўства; аранжарэя; 9 філіялаў кафедраў на прадпрыемствах.

**70** усяга выкладчыкаў

**592** студэнты

**8** дактароў

**39** кандыдаў навук



### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

- **«Геаграфія»**, напрамак «Навукова-педагагічная дзейнасць».

Кваліфікацыя *«Географ. Выкладчык геаграфіі»*.

Месцы працаўладкавання: падраздзяленні выканкамаў; установы сярэдняй і вышэйшай адукацыі; арганізацыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: Інстытут эканомікі, Інстытут працы, Інстытут эксперыментальнай батанікі, Інстытут пладаводства, Навукова-практычны цэнтр па біярэсурсах; падраздзяленні Мінпрыроды: «Белдзяржлес» і інш.

- **«Гідраметэаралогія»**.

Кваліфікацыя *«Географ. Гідраметэаролаг»*.

Месцы працаўладкавання: падраздзяленні Мінпрыроды: «Белгідрамет», абласныя цэнтры па гідраметэаралогіі; ННДЦ маніторынгу азонасферы; структуры Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання: аграметэастанцыі; структуры дэпартаменту па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый; авіякампанія «Белавія» і інш.

- **«Космааэракартаграфія»**.

Кваліфікацыя *«Географ. Спецыяліст па картографа-геадэзічнай дзейнасці»*.

Месцы працаўладкавання: Дзяржкамітэт па маёмасці Беларусі: «Белгеадэзія», «Белкартаграфія», БелПСХАГІ; Цэнтр НТІ, «Беларуская чыгунка» і інш.

- **«Геатэхналогіі турызму і экскурсійная дзейнасць»**.

Кваліфікацыя *«Географ. Спецыяліст па геатэхналогіях турызму і экскурсійнай дзейнасці»*.

Месцы працаўладкавання: турыстычныя арганізацыі: «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму», «Цэнтркурорт», «Белтурыст», «Белкурорт», «Тэз-тур», «Ваяжтур»; інфармацыйна-экскурсійныя цэнтры курортаў і нацыянальных паркаў і інш.

- **«Геаэкалогія»**.

Кваліфікацыя *«Географ-эколаг. Выкладчык геаграфіі і экалогіі»*.

Месцы працаўладкавання: падраздзяленні Мінпрыроды і Мінлясгаса Беларусі: гарадскія і раённыя інспекцыі аховы прыроды, БелНДЦ «Экалогія» і інш.; Дзяржінспекцыя па ахове жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі; прыродаахоўныя арганізацыі: нацыянальныя паркі «Нарачанскі» і «Браслаўскія азёры», заказнік «Спораўскі» і інш.; установы, якія рэалізуюць стратэгію зялёнай эканомікі: «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў», «Інстытут праблем рэсурсазберажэння» і інш.; экалагічная экспертыза для будаўніцтва: БелНДІПградабудаўніцтва, «Мінскграда», «Белдзіпрадар» і інш.; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі: Інстытут прыродакарыстання, НПЦ па біярэсурсах і інш.; установы сярэдняй і вышэйшай адукацыі Беларусі.

- **«Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў»**.

Кваліфікацыя *«Інжынер-геолаг»*.

Месцы працаўладкавання: упраўленне па геалогіі Мінпрыроды, НПЦ па геалогіі, «Белдзяржгеацэнтр», «Белгеалогія», «Белгархімпрам», «Газпрамтрансгаз», «Геасэрвіс», «Белгеапошук», «Белдзіпрапалгаз», «Белдзіпрадгас», «Дзяржпрабнагляд», «Дзяржбуднагляд», Дзяржаўны мытны камітэт.

- **«Геаінфармацыйныя сістэмы»**, напрамак «Зямельна-кадастравыя».

Кваліфікацыя *«Спецыяліст па кадастры і геаінфармацыйных сістэмах»*.

Месцы працаўладкавання: прадпрыемствы і арганізацыі Дзяржкамітэта па маёмасці: «Белдзіпразем», Нацыянальнае кадастравае агенцтва і інш.; БелНДІПградабудаўніцтва, БелГІС, прыватныя ІТ-кампаніі, прадпрыемствы геаінфармацыйнага профілю.

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Факультэтам заключана больш за 20 пагадненняў з прадпрыемствамі. Сумесная падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўляецца на базе філіялаў кафедраў, створаных у ДУ «Рэспубліканскі гідраметэаралагічны цэнтр»; РУП «Белгеадэзія» і «Белкартаграфія»; у інстытутах глебазнаўства і аграхіміі; прыродакарыстання; навукова-вытворчым цэнтры па геалогіі; РУП «Інстытут пладаводства»; РНУП «БелНДЦ „Экалогія"»; ААТ «Белгархімпрам»; РУП «БелНДІПградабудаўніцтва». Спецыялісты прадпрыемстваў кіруюць вытворчымі практыкамі і праводзяць заняткі.

### МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Выкладчыкі і студэнты праходзяць стажыроўкі ў Партугаліі, Канадзе, Германіі, Славакіі, Швецыі, ЗША, Польшчы, Чэхіі, Літве, В'етнаме, Расіі (праекты акадэмічнага абмену SCOPUS+ і DAAD, праграмы фонду ААН).

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Дзейнічаюць тры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі і чатыры навуковыя студэнцкія гурткі. Студэнцкая ГІС-лабараторыя шэсць разоў запар прызнана самай лепшай у БДУ. Найлепшым навуковым гуртком у 2021 г. у галіне прыродазнаўчых навук стаў гурток «Гідраметэаэролаг». Студэнты рэгулярна перамагаюць у Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац і прэміруюцца спецфондам Прэзідэнта Беларусі. У 2021 г. студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя рэгіянальнай геалогіі і геахіміі атрымала грант спецфонду Прэзідэнта Беларусі. За 2021 год студэнтамі апублікавана больш за 100 навуковых прац.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Па ініцыятыве студэнтаў-географаў у БДУ праводзіцца «Сутычка» і турыстычны злёт, а таксама «Дзень ГІС», «Ноч на геа», «Што? Дзе? Калі?», «ГастраГеа», «Містар Геа» і «Міс Геа». Папулярнасць набылі «ГеаФокус» і «ГеаКвест». Узмацняюць і натхняюць на плён творчы саюз факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі, добраахвотніцкая група «Абдымкі геафака», студэнцкая газета «Экватар».

### ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

Штогод у супрацоўніцтве з 60 ліцэямі, гімназіямі, школамі і іншымі структурамі Міністэрства адукацыі арганізуем «Тыдзень геаграфіі БДУ», больш за 50 гадоў працуе школа географаў, краязнаўцаў і географаў, пакладзены пачатак адкрытай алімпіядзе БДУ па геаграфіі.

## Водгукі выпускнікоў



**Таццяна ТАБАЛЬЧУК, дырэктар ННДЦ маніторынгу азонасферы. Выпускніца 2012 г.**

– Маё сэрца засталося на факультэце, які тады называўся геаграфічным. Само навучанне было максімальна шматгранным, разнастайным. І ў пэўны момант жыцця ты разумееш, што раніцай можаш прачнуцца на беразе ракі ў палатцы і выйсці ў туман, а ўвечары весці свецкія размовы ў фае тэатра, і ўсюды адчуваць сябе камфортна. Мне найбольш падабаецца выраз, што географ – гэта задуменны вандроўнік і архітэктар навакольнага свету і адначасова метэаролаг, які заўважае абсалютна ўзрушальныя адметнасці, проста ўзняўшы галаву ўгару, на нябёсы. А яшчэ практыкі: навучальная – на геабазе і далёкая – па абшарах Беларусі.
Падрыхтоўка на геафаку шырокая, нават занадта моцная для якой-небудзь адной спецыяльнасці. Ці магу я зараз сказаць, што мне не хапіла ведаў па выбраных курсах? Так, хацелася б больш пар па атмасферных навуках, а ў дадатак – якаснага курса па праграмаванні, без гэтага зараз нікуды. Тым больш падмурак для спецыяльнасці выдатны, і пра выбар факультэта мне пашкадаваць не прыйшлося.



**Руслан МІХАЛЕВІЧ, Дырэктар РУП «БелНДЦ "Экалогія"». Выпускнік 2012 г.**

– Хоць вучоба на геафаку даўно скончана, але я з глыбокай падзякай стаўлюся да досведу і магчымасцяў, якія там набыў. Ведаць усё пра ўсё – немагчыма, а пра многае – рэальна! Разумець узаемасувязі прасторавых з'яў, валодаць звесткамі пра іх размеркаванне і змену – выдатны навык. Жадаю факультэту развіваць напрамкі прасторавага маніторынгу і геаэкалагічнага вывучэння на карысць людзям і нашай краіне.

# Факультэт журналістыкі








Дэкан – кандыдат філалагічных навук дацэнт Вольга Міхайлаўна САМУСЕВІЧ

Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9

Тэл. 259-74-00

E-mail: jour@bsu.by

www.journ.bsu.by

## Факультэт журналістыкі – галоўны ў Беларусі цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў для сферы медыявытворчасці і масавых камунікацый

У структуру факультэта ўваходзіць 7 кафедраў, якія ахопліваюць самыя розныя навуковыя кірункі – тэорыю і практыку журналістыкі, камунікацыі, медыялогію, творчы працэс у друкаваных, вэб- і аўдыявізуальных СМІ, гісторыю СМІ, даследаванні мовы і стылю СМІ, псіхалогію журналістыкі і г. д.

Навучаюцца 1107 студэнтаў (987 на першай ступені, 120 – у магістратуры), сярод якіх – 504 навучэнцы з Кітая, Расіі, Казахстана, Японіі, Украіны і іншых дзяржаў.

**145** усяго выкладчыкаў

**1107** студэнтаў

**8** дактароў

**68** кандыдатаў навук

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

- **«Журналістыка (па напрамках)»** (кваліфікацыя *«Журналіст»*). Пасады: рэдактар, выпускаючы, адказны, аглядальнік палітычны, аглядальнік па эканамічных пытаннях, каментатар, карэспандэнт, карэспандэнт спецыяльны, вядучы праграмы, рэдактар інтэрнэт-рэсурсу.
- **«Журналістыка міжнародная»** (кваліфікацыя *«Журналіст-міжнароднік»*). Пасады: аглядальнік палітычны, аглядальнік па эканамічных пытаннях, карэспандэнт уласны, замежны карэспандэнт.
- **«Інфармацыя і камунікацыя»** (кваліфікацыя *«Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі»*). Пасады: спецыяліст па сувязях з грамадскасцю, спецыяліст па рэкламнай камунікацыі, прэс-сакратар, рэдактар інтэрнэт-рэсурсу.

**ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС**

Журналістыка – творчая дзейнасць, таму на факультэце актыўна выкарыстоўваюцца праектныя, практыка-арыентаваныя падыходы. Студэнты з дапамогай выкладчыкаў выпускаюць газету «Журфакты», развіваюць анлайн-праекты Websmi.by, Studlive.by, вядуць карпаратыўныя акаўнты факультэта ў сацыяльных сетках, ствараюць вучэбныя відэапраекты.

Факультэт заключыў дамовы аб узаемадзеянні з 22 арганізацыямі, стварыў 2 інавацыйныя медыйныя кластары, мае 9 філіялаў кафедраў на базе СМІ краіны, дзе практыкуюцца студэнты з першага курса.

Інтэнсіўна ўкараняюцца дыстанцыйныя метады навучання. Каля 800 вучэбных праграм па дысцыплінах размешчана на адукацыйным партале Moodle.

Дзейнічаюць студэнцкія навуковыя гурткі, лабараторыі («Крытык», «Медыястыліст», «Медыяпсіхолаг» і інш.).

**МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ**

На факультэце можна атрымаць не толькі рознабаковыя веды, але і параўнаць заходнюю і ўсходнюю мадэлі вышэйшай адукацыі. Нашы студэнты прымаюць удзел у міжнародных праектах, напрыклад, «Эразмус+». Гэта магчымасць на семестр стаць студэнтам аднаго з еўрапейскіх універсітэтаў. Таксама факультэт актыўна супрацоўнічае з універсітэтамі КНР. Студэнты могуць на працягу года вывучаць кітайскую мову і культуру непасрэдна ў Кітаі, у Хэнанскім універсітэце. На базе факультэта працуе Беларуска-кітайскі медыяцэнтр.

**ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ**

Выпускнікі журфака працуюць на тэлеканалах і радыёстанцыях, у рэдакцыях рэспубліканскіх, рэгіянальных і карпаратыўных газет, на вэб-рэсурсах, у інфармацыйных агенцтвах, прэс-цэнтрах, службах па сувязях з грамадскасцю, выдавецтвах.

Першае працоўнае месцаў 2021 годзе атрымалі ўсе выпускнікі факультэта.

**ЖУРФАК – АБІТУРЫЕНТАМ**

На працягу навучальнага года працуюць падрыхтоўчыя курсы па дысцыпліне «Творчасць», заняткі на якіх вядуць выкладчыкі факультэта журналістыкі. Летнія курсы (два тыдні) можна наведаць непасрэдна перад пачаткам прыёмнай кампаніі.

«Школа маладога журналіста» – гэта магчымасць бясплатна паўдзельнічаць у майстаркласах выкладчыкаў і журналістаў, падрыхтаваць першыя публікацыі.

«Акадэмія камунікацыі» – адукацыйны праект для ўсіх, каго цікавіць свет PR і рэкламы. Слухачы акадэміі атрымліваюць веды з розных сфер камунікацыйнай дзейнасці: вучацца мастацтву публічных выступленняў, мабільнай і інтэрнэт-камунікацыі, арганізацыі мерапрыемстваў.

**Журфак дае магчымасць праз штодзённую практыку атрымаць прафесію і асвоіць актуальную творчую спецыялізацыю – рэпарцёра, палітычнага аглядальніка, артжурналіста, фотакарэспандэнта і інш.**

## Водгукі выпускнікоў



**Марыя ПЯТРАШКА, палітычны аглядальнік Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі, выпускніца 2017 года.**

– На факультэце журналістыкі для мяне не было бескарысных вучэбных прадметаў. Кожная інфармацыя была цікавай па-свойму і потым спатрэблілася ў самых розных сітуацыях. Журфак як структура БДУ – гэта цудоўная магчымасць раскрыць усе свае здольнасці ў грамадскіх арганізацыях. Журфак натхняе праз майстар-класы прафесіяналаў-практыкаў. Але што самае галоўнае, факультэт прывучае цябе самога станавіцца практыкам. А гэта самае галоўнае для журналіста, на маю думку.



**Святлана ІСАЁНАК, спецкарэспандэнт газеты «СБ. Беларусь сегодня», выпускніца 2013 года.**

– У 2008 годзе, калі я паступала на факультэт журналістыкі, ніхто не верыў, што будучыня за вэб-журналістыкай, але я паверыла. З часам стала зразумела, што выбар быў правільным. Менавіта вучоба на журфаку дала мне той самы базіс, які дапамагае ўпэўнена пачувацца ў прафесіі і свабодна рабіць інтэрв'ю як з навукоўцам, так і з бухгалтарам, са злачынцам або суддзёй. Журфак не проста дае веды – ён вучыць разумець жыццё і тыя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве. Дзякуючы выдатным выкладчыкам да рэаліяў прафесіі я была гатовая ўжо на старце кар'еры.



**Ігар ТУР, палітычны аглядальнік дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАА «Другі нацыянальны тэлеканал», выпускнік 2011 года.**

– Журфак для мяне – гэта першая асэнсаваня і спраўджаная мара. Я вельмі хацеў паступіць менавіта сюды, таму прынцыпова нават не здаваў трэцяе ЦТ, каб ужо зусім не было варыянтаў: толькі журфак. Факультэт журналістыкі – гэта выдатная школа працы з вялікай колькасцю даных і рознымі крыніцамі інфармацыі. Я ўдзячны за набытую адсутнасць страху перад дэдлайнамі. За гады студэнцтва зразумеў: ноч напярэдадзе – гэта ж вагон часу!

Я жадаю альма-матар заўсёды быць розНай. Наша прафесія змяняецца ў гэтым шалёным медыярытме так хутка, што ўсе мы вучымся новаму: і практыкі, і тэарэтыкі. І ў гэтым выключнасць журфака: нават калі пасля лета сустракаюцца тыя ж студэнты выкладчыкі, яны заўсёды крыху розныя. І няхай захоўваецца аўра пастаяннай пераменлівасці, таму што вучыцца тут – гэта заўсёды імправізаваць. Менавіта гэта – галоўнае для журналіста.



**Вадзім ШЧАГЛОЎ, журналіст, генеральны прадзюсер ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал», выпускнік 2012 года.**

– Журфак для мяне – гэта вялікая школа. Прычым гаворка не толькі пра прафесійныя веды. У першую чаргу нас вучылі быць людзьмі, памятаць пра самае важнае ў прафесіі, не здраджваць працы, якую мы абралі справай жыцця. Журфак – гэта самыя лепшыя выкладчыкі, сябры, якія засталіся на ўсё жыццё, гэта ўспаміны, якія праз гады ўсё такія ж яркія.

# Факультэт міжнародных адносін

Дэкан – кандыдат палітычных навук дацэнт Алена Анатольеўна ДАСТАНКА

Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20

Тэл. 209-59-77

E-mail: fir@bsu.by

www.fir.bsu.by







## На ФМА студэнты вывучаюць дзве замежныя мовы з 15, што выкладаюцца на факультэце

У складзе факультэта 14 кафедраў. Навучаюцца каля 2000 студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, у тым ліку больш за 450 замежных навучэнцаў з 23 краін.

**300** усяго выкладчыкаў

**1700** студэнтаў

**19** дактароў

**90** кандыдатаў навук

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Вядзецца падрыхтоўка па 6 спецыяльнасцях (18 спецыялізацый) на I ступені вышэйшай адукацыі:

- **Міжнародныя адносіны**
Кваліфікацыя: *«Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем мовы зносін)».*

- **Міжнароднае права**
Кваліфікацыя: *«Юрыст-міжнароднік з веданнем замежных моў (з указаннем моў зносін)».*

- **Сусветная эканоміка**
Кваліфікацыя: *«Эканаміст».*

- **Менеджмент** (напрамак «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму»)
Кваліфікацыя: *«Менеджар-эканаміст. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем дзвюх замежных моў)».*

- **Мытная справа**
Кваліфікацыя: *«Спецыяліст мытнай справы».*

- **Лінгвакраіназнаўства**
Кваліфікацыя: *«Усходазнаўца-міжнароднік. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем мовы зносін)».*

### ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ

У нас вывучаюцца замежныя мовы: англійская, французская, італьянская, іспанская, партугальская, шведская, нямецкая, польская, кітайская, карэйская, японская, персідская, арабская, хіндзі, турэцкая, руская мова як замежная.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

На факультэце з удзелам студэнтаў развіваецца сайт, выдаецца студэнцкая газета «ФМOnline».

З 1999 года факультэт міжнародных адносін першым у краіне пачаў праводзіць «Мадэляванне ААН». Гэта ролевая гульня праходзіць на англійскай мове двойчы на год – у красавіку і лістападзе.

### ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ

На ФМА рэгулярна арганізуюцца сустрэчы студэнтаў і выкладчыкаў з дзяржаўнымі і палітычнымі дзеячамі, беларускімі і замежнымі дыпламатамі, кіраўнікамі міністэрстваў і ведамстваў, прадстаўнікамі найбуйнейшых сусветных карпарацый, прадпрыемстваў і арганізацый, дзеячамі культуры і мастацтва.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Студэнты прымаюць актыўны ўдзел у канферэнцыях, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах, дзейнічаюць 5 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, 36 навуковых гурткоў і клубаў, дзе кожны ахвотнік знойдзе сабе сферу па інтарэсах, а таксама матывацыйнае асяроддзе і каворкінг з калегамі па студэнцкай лаве.

Выпускаецца зборнік навуковых артыкулаў студэнтаў, аспірантаў і магістрантаў (выдадзена 25 выпускаў).

Факультэт арганізуе буйную штогадовую студэнцкую канферэнцыю ў красавіку, дзе арганізавана каля 60 секцый. Даклады пераможцаў публікуюцца.

Кожны год на ФМА БДУ адбываецца «Тыдзень студэнцкай навукі».

ФМА рэгулярна праводзіць міжнародныя канферэнцыі, сярод якіх «Беларусь у сучасным свеце» і «Міжкультурная камунікацыя і прафесійна арыентаванае навучанне замежным мовам» і іншыя.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Нашы выпускнікі працуюць у Міністэрстве замежных спраў, Дзяржаўным мытным камітэце, практычна ва ўсіх міністэрствах і ведамствах краіны, у структурах міжнародных арганізацый. Значная частка выпускнікоў звязала сваю працоўную кар'еру з рэальным сектарам эканомікі, паспяхова развівае ўласны бізнес, працягвае навуковапедагагічную кар'еру. Факультэт рэгулярна атрымлівае падзякі, у якіх адзначаюцца высокія прафесійныя якасці нашых выхаванцаў.

### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Магчымасць навучання за мяжой для студэнтаў факультэта рэалізуецца пасродкам акадэмічных абменаў у рамках аб супрацоўніцтве паміж БДУ і замежнымі ВНУ, а таксама ў рамках праграм акадэмічнай мабільнасці. На працягу навучальнага года некалькі сотняў студэнтаў ФМА БДУ бяруць удзел у розных праграмах акадэмічнай мабільнасці. Гэта не толькі кароткатэрміновыя візіты, канферэнцыі, семінары, конкурсы ці адна- і двухтыднёвыя школы. Гэта яшчэ і навучанне на працягу ад 3 месяцаў да года ў замежных універсітэтах, уключаючы Кітай, Паўднёвую Карэю, Японію, Расію і шматлікія іншыя дзяржавы.

Усё, што патрабуецца ад студэнтаў, – веды замежнай мовы, добрая вучоба і ініцыятыва! Адкрыйце для сябе свет адукацыі разам з намі!

**Чакаем вас на факультэце міжнародных адносін БДУ!**



## Водгукі выпускнікоў



**Ягор ГАФАРАЎ, вядучы рэферэнт аддзела маркетынгу і якасці турысцкіх паслуг дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму. Выпускнік спецыяльнасці «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму» 2021 г.**

– На працы штодня камунікую з выпускнікамі ФМА. Тэлефануючы ў беларускую замежную ўстанову і натыкаючыся на дзіўна прыемнага, ветлівага, тактоўнага і эрудзіраванага супрацоўніка, адразу задаю пытанне: «Вы заканчвалі ФМА?» – і атрымліваю сцвярджальны адказ. Нашых выпускнікоў адрознівае мысленне і манера размовы, дзякуючы чаму лёгка апазнаць адзін аднаго нават па тэлефоне. Ну а пасля таго, як становіцца вядома пра агульную alma mater, сумесная праца становіцца яшчэ больш прыемнай і прадуктыўнай. Мала якая навучальная ўстанова можа пахваліцца такім развітым пачуццём агульнасці паміж выпускнікамі, за што я шчыра ўдзячны нашаму факультэту.



**Уладзіслава ТРОШКА, сакратар-перакладчык Пасольства Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Рэспубліцы Беларусь. Выпускніца спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» 2021 г.**

– Калі ў 2017 годзе я прыйшла на першае пасяджэнне першакурснікаў ФМА, я адразу адчула, што ў гэтага месца ёсць асаблівая атмасфера. І ўжо пасля, асэнсоўваючы свой вопыт на факультэце, я зразумела, у чым сакрэт. ФМА – гэта і ёсць дыпламатыя, якой нас тут актыўна навучалі. Гэта кластар/суполка/цэнтр, асноўнай мэтай якога з'яўляецца наладжванне сувязяў абсалютна рознага характару і з дапамогай розных сродкаў: праз семінары, канферэнцыі, запрашэнні цікавых спікераў, праграмы абмену, мерапрыемствы, студэнцкія арганізацыі. І самае галоўнае: сувязі гэтыя працавалі і ў камунікацыі паміж дэканатам, выкладчыкамі і студэнтамі, а таксама на міжасабовым узроўні. Ужо працуючы, я часта сустракаюся з «ФМАшнікамі». І з упэўненасцю магу сказаць, што ў асноўным гэта адкрытыя і альтруістычныя людзі, якія заўсёды памятаюць, адкуль яны прыйшлі, і ніколі не будуць ставіцца дрэнна да тых, хто калісьці таксама быў часткай альма-матар, таму што яны ведаюць, што гэтыя людзі падобныя да іх і пэўны час таму належалі сваім сэрцам гэтаму цудоўнаму месцу.

# Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі







ФПМІ

Дэкан – доктар тэхнічных навук дацэнт Аляксандр Міхайлавіч НЕДЗЬВЕДЗЬ

Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4

Тэл. 209-52-45

E-mail: dean_office_fpmi@bsu.by

www.fpmi.bsu.by

**230** усяго выкладчыкаў

**1400** студэнтаў

**3** акадэміі

**19** дактароў

**87** кандыдатаў навук

## Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – вядомы ў Беларусі і за мяжой брэнд

Узровень падрыхтоўкі на факультэце ў галіне матэматыкі і сістэмнага праграмавання адпавядае найлепшым сусветным узорам.

Дзейнічаюць 11 кафедраў, 2 НДЛ, цэнтр адукацыйных, цэнтр кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях, школа аналізу даных, а таксама 6 філіялаў на базе АІПІ НАН Беларусі і шэрагу IT-кампаній.

ФПМІ ўяўляе сабой навукова-адукацыйны комплекс, працуе сумесна са створанымі на яго базе НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі і Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ў галіне тэхналогій інфарматызацыі і кіравання.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

- **«Прыкладная матэматыка»**, напрамак: навукова-вытворчая дзейнасць. Кваліфікацыя – *«Матэматык-праграміст»*.
- **«Інфарматыка»**. Кваліфікацыя – *«Матэматык – сістэмны праграміст»*.
- **«Эканамічная кібернетыка»**, напрамак: матэматычныя метады і камп'ютарнае мадэляванне ў эканоміцы. Кваліфікацыя – *«Матэматык-эканаміст»*.
- **«Камп'ютарная бяспека»**, напрамак: матэматычныя метады і праграмныя сістэмы. Кваліфікацыя *«Спецыяліст па абароне інфармацыі. Матэматык»*.
- **«Прыкладная інфарматыка»**, напрамак: праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм. Кваліфікацыя – *«Інфарматык. Спецыяліст па распрацоўцы праграмнага забеспячэння»*.

**СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ**

Факультэт цесна супрацоўнічае і мае афіцыйныя дамовы аб падрыхтоўцы спецыялістаў з Нацыянальным банкам і шматлікімі камерцыйнымі банкамі, больш як са 100 кампаніямі ПВТ і іншымі арганізацыямі, сярод якіх «Беларусбанк», «Прыёрбанк», «Белінвестбанк», «ЭПАМ Сістэмз», IBA, «Ітранзішн», «Сістэмныя тэхналогіі», «Гейм Стрым», «ЯндэксБел», «Вайбер Медыя», «Ісофт Салюшэнз», «НавучСофт», «Софтклуб» і іншыя.

**МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ**

Нашы студэнты ўдзельнічаюць у адукацыйных праграмах у Нарвегіі, Германіі, Італіі. Факультэт паспяхова працуе і ў рамках міжнародных праектаў (Tempus, Erasmus+, DAAD). Распрацаваны шэраг сумесных магістарскіх праграм.

**СТУДЭНЦКАЕ ЖЫЦЦЁ**

Студэнцкае жыццё насычана яркімі падзеямі: турсцяжына першакурсніка, студэнцкія капуснікі, канцэрты факультэцкай каманды КВЗ, калядная акцыя «ФПМушка» і, вядома, дзень нараджэння факультэта – 1 красавіка!

Кожны год з'яўляюцца і новыя мерапрыемствы, якія становяцца ўнікальнымі падзеямі ў культурным і інтэлектуальным жыцці факультэта: «Лямпавы вечар», «Музычныя пятніцы», кінавечары і размовы пра сапраўднае кіно і іншыя.

**СІСТЭМА БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ**

На факультэце дзейнічае сістэма бесперапыннай адукацыі, арыентаваная на прадметы «Матэматыка» і «Інфарматыка». Сістэма ўключае пастаянныя школы для юнацтва (пачынаючы з 5 класа СШ) і мерапрыемствы алімпіядна-конкурснага і навучальнага характару (алімпіяды, канферэнцыі, вучэбныя зборы рознага ўзроўню, летнія школы).

Вынікам з'яўляецца высокі ўзровень абітурыентаў, якія паступаюць на факультэт. На факультэце ёсць факультатыўныя курсы для тых, каму патрэбная дапамога пры пераходзе са школы ва ўніверсітэт, курсы, семінары, школы для найбольш зацікаўленых у далейшым паглыбленні сваіх ведаў і навыкаў у розных галінах сучаснай матэматыкі і інфарматыкі (школа аналізу даных, семінары па дадатковых раздзелах матэматыкі і інфарматыкі).

І як пастаянны вынік – поспехі нашых студэнтаў на самых прэстыжных рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах.

**ДАСЯГНЕННІ**

Студэнты ФПМІ шматразова былі фіналістамі каманднага чэмпіянату свету па праграмаванні (ACM ICPC), у якім прымаюць удзел каманды звыш 2300 універсітэтаў! Найвышэйшага поспеху наша каманда дасягнула ў 2004 г., калі заваявала ***залатыя*** медаль, у 2008 г. – ***бронзавы***, а ў 2012, 2013 і 2021 гг. – ***сярэбраныя***.

Увесь час нашы студэнты і выпускнікі дэманструюць высокія вынікі ў спаборніцтвах праграмістаў (IEEEXtreme, TopCoder, Google HashCode, BelHuawei і іншых).

Адным з апошніх прыкладаў стала абсалютная перамога студэнтаў ФПМІ Івана Лук'янава і Дзяніса Кіма у верасні 2020 года ў спаборніцтвах праграмістаў BelHuawei Challenge, а таксама перамогі ў розных намінацыях на фінале алімпіяды «IT-Планета 2020/21».

На алімпіядах па матэматыцы з 2001 г. студэнты ФПМІ заваявалі больш за 80 медалёў (сярод іх – 40 залатых), у тым ліку першыя месцы (двойчы) у камандным спаборніцтве.

Адзначым, што:

– больш за 1200 студэнтаў сталі лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта РБ па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, сярод іх 187 студэнтаў узнагароджаны нагруднымі знакамі;

– дактарамі навук сталі больш за 50 выпускнікоў, а непасрэдна супрацоўнікамі факультэта абаронены больш за 30 доктарскіх дысертацый, на факультэце падрыхтавана і абаронена больш за 300 кандыдацкіх дысертацый, апублікавана каля 500 манаграфій, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

## Водгукі выпускнікоў



**Міхаіл КАВАЛЁЎ, намеснік генеральнага дырэктара Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі. Выпускнік 1982 г.**

– Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – гэта сям'я, якая можа ганарыцца сваімі традыцыямі, адносінамі, ведамі і дасягненнямі. Здаецца, учора я здаваў уступны экзамен Адольфу Фёдаравічу Навумовічу, мы радаваліся зносінам з Уладзімірам Трафімавічам Водневым, жартавалі са стылю падачы матэрыялу Юрыя Станіслававіча Багданава і Віктара Іванавіча Карзюка, радаваліся новым нумарам і песням агітбрыгады і студэнцкага тэатра, збіралі заплечнікі ў паходы і будатрады. Быццам мы не змяніліся. Проста з'явіліся новыя студэнты і выкладчыкі, нашы сябры і аднадумцы, і мы – самыя лепшыя!



**Уладзімір РЫЖЫХ, намеснік генеральнага дырэктара па распрацоўцы праграмнага забеспячэння замежнага прадпрыемства IBA IT Park. Выпускнік 1994 года.**

– Мне пашчасціла сустракацца і працаваць з выпускнікамі ФПМІ практычна ўсіх выпускаў, пачынаючы з першага, і магу сказаць, што іх заўсёды адрозніваліі глыбокія веды фундаментальных навук, сістэмнае мысленне, здольнасць вырашаць самыя складаныя задачы, але, галоўнае – здольнасць вучыцца новаму і быць паспяховымі ў самых розных сферах жыцця. У гэтым вялікая заслуга зорнага складу.

Студэнцкія гады – гэта свет бязмежных магчымасцяў. Заўсёды з вялікай цеплынёй, падзякай і павагай успамінаю сваіх выкладчыкаў, якія былі для мяне праваднікамі ў гэтым свеце.

Развіццё інфармацыйных тэхналогій ідзе імклівымі тэмпамі – гэтаму нельга раз і назаўжды навучыцца ў ВНУ, але, маючы той багаж ведаў і навыкаў, які дае ФПМІ, любыя тэхналогіі і задачы будуць па сілах.



**Аляксей ТУЗІКАЎ, генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі. Выпускнік 1980 г.**

– ФПМІ – сапраўдны лідар у краіне па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Высокая якасць адукацыі – на ўзроўні самых прэстыжных сусветных стандартаў – заснавана перш за ўсё на высокапрафесійных спецыялістах, якія працуюць на факультэце, а таксама на скрупулёзным адборы абітурыентаў. Нездарма попыт на выпускнікоў ФПМІ не проста высокі – у любой арганізацыі (навуковая ўстанова, ВНУ, банк або IT-кампанія) кожны кіраўнік ведае: выпускнікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі адразу і лёгка ўключаюцца ў самую складаную працу і дамагаюцца поспеху.

# Факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій

Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Дзмітрый Уладзіміравіч УШАКОЎ

Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5

Тэл. 209-58-18, 209-59-03

E-mail: UshakovDV@bsu.by

www.rfe.bsu.by





У 1976 г. адкрыты факультэт радыёфізікі і электронікі. У 2010 г. ён перайменаваны ў факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій

У структуры: 8 кафедраў, 4 навукова-даследчыя лабараторыі, 3 СНДЛ, даследча-тэхналагічны цэнтр «Нанатэхналогіі і фізічная электроніка», цэнтр аэракасмічнай адукацыі, сучасныя навучальныя лабараторыі і камп’ютарныя класы.

Навучаюцца 905 студэнтаў, 60 магістрантаў, 28 аспірантаў, 8 дактарантаў.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

- **«Радыёфізіка»**, кваліфікацыя *«Радыёфізік»*.
- **«Камп’ютарная бяспека»** (напрамак: радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі), кваліфікацыя *«Спецыяліст па ахове інфармацыі. Радыёфізік»*.
- **«Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі»**, кваліфікацыя *«Спецыяліст па аэракасмічных радыёэлектронных і інфармацыйных сістэмах. Радыёфізік»*.
- **«Прыкладная інфарматыка»** (напрамак: інфармацыйныя тэхналогіі тэлекамунікацыйных сістэм), кваліфікацыя *«Інфарматыка. Спецыяліст па інфармацыйных тэхналогіях тэлекамунікацыйных сістэм»*.

По ўсіх спецыяльнасцях студэнты атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па матэматыцы, фізіцы, электроніцы і інфарматыцы. У рамках спецыяльнай падрыхтоўкі студэнты маюць магчымасць асваення сучасных інфармацыйных тэхналогій, уключаючы: інтэлектуальны аналіз даных, машыннае і глыбокае навучанне, камп’ютарныя сеткі і хмарныя тэхналогіі, базы даных, камп’ютарную графіку, віртуальную і дапоўненую рэальнасць, ГІС-тэхналогіі і інш. Студэнты ўсіх спецыяльнасцяў атрымліваюць падрыхтоўку па праграмаванні на мовах C ++, Java, MatLab, Python і інш.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі факультэта працуюць у розных сферах інфармацыйных тэхналогій, тэлекамунікацый, радыёэлектроннага і аптычнага прыборабудавання, праграмаванай электронікі, мікра- і нанаэлектронікі, лазерных аптычных тэхналогій. Большасць выпускнікоў факультэта размяркоўваюцца і паспяхова працуюць у кампаніях-рэзідэнтах Парка высокіх тэхналогій (EPAM Systems, Itransition, BelHard, IBA, «Навучсофт» і інш.).

**965** студэнтаў

**120** усяго выкладчыкаў

**1** акадэмік

**1** член-карэспандэнт

**15** дактароў

**51** кандыдат навук

Сярод іх ёсць кіраўнікі і вядучыя спецыялісты навукова-вытворчых аб’яднанняў, даследчых інстытутаў, ВНУ, вядомыя бізнесмены.

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Пры правядзенні навучальнай і навуковай працы, выкананні курсавых і дыпломных актыўна выкарыстоўваюцца філіялы кафедраў у НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, «НТЛабсістэмах», на «Інтэграле», «Планары». На факультэце створаны сумесныя навучальна-навуковыя лабараторыі з вядучымі і высокатэхналагічным кампаніямі: EPAM Systems, Motorola, Itransition, MOXA.

### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Інтэнсіўна развіваецца навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва з вядучымі замежнымі навуковымі цэнтрамі і ўніверсітэтамі Расіі, Германіі, Францыі, Даніі, Люксембурга, Нарвегіі, Швейцарыі, Нідэрландаў, Казахстана і інш.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Студэнты займаюцца даследаваннямі на базе навуковых лабараторый факультэта, НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, інстытутаў і цэнтраў НАН Беларусі, навукаёмістых прадпрыемстваў. Функцыянуюць чатыры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі: «Паўправадніковыя лазеры», «Нанатэхналогіі і камп’ютарнае мадэляванне», «Мадэляванне і аналіз стахастычных працэсаў і сістэм» і «Робататэхніка і ўбудаваныя сістэмы». Студэнты, магістранты і аспіранты прымалі ўдзел у распрацоўцы ***універсітэцкага нанаспадарожніка***, запуск якога на калязямную арбіту адбыўся ў 2018 г. У 2022 г. БДУ плануе запусціць другі навукова-адукацыйны спадарожнік. Новы спадарожнік валодае большым патэнцыялам для правядзення касмафізічных эксперыментаў з выкарыстаннем айчынных матэрыялаў і паўправадніковых прылад. Так, на арбіце будзе сфарміраваная першая беларуская групоўка з двух навукова-адукацыйных спадарожнікаў для адпрацоўкі іх узаемадзеяння і каардынацыі.

### СТАЖЫРОЎКІ

Рэалізуюцца праграмы стажыроўкі студэнтаў у вядучых навуковых цэнтрах Еўропы: Luxembourg Institute of Health (Штрасэн, Люксембург), Institute of Science and Technology (Вена, Аўстрыя), Helmholtz-Zentrum Dresden Rossendorf (HZDR) (Германія), Deutsches Elektronen Synchrotron (DESY) (Гамбург, Германія), The European Organization for Nuclear Research (CERN) (Жэнева, Швейцарыя).

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Штогод ладзяцца: Дзень радыёфізіка, капуснік, «Міс» ці «Містар факультэта», навагодні вечар. Кожныя пяць гадоў сумесна з Беларускім рэспубліканскім грамадскім аб’яднаннем радыёфізікаў праводзяцца юбілейныя мерапрыемствы.

Круглы год праходзяць творчыя вечары праекта «Комната», квесты, конкурсы, фотавыставы. Актыўна працуюць шэсць студэнцкіх моладзевых арганізацый: творчы і студэнцкі саюзы, прафсаюзная арганізацыя і ячэйка ГА «БРСМ», савет старастаў і студэнцкі савет па якасці адукацыі.

Турніры па футболе, тэнісе, баскетболе, веласпорце, валейболе збіраюць не толькі студэнтаў усіх курсаў, але і выкладчыкаў.

### ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

З многімі школамі, гімназіямі і ліцэямі заключаны дамовы аб супрацоўніцтве. Праводзяцца экскурсіі па факультэце для школьнікаў з наведваннем кафедраў, лабараторый. Выкладчыкі і студэнты выступаюць перад абітурыентамі. Са школьнікамі ажыццяўляецца падрыхтоўка да алімпіяд і навуковых канферэнцый па фізіцы, да ЦТ па фізіцы і матэматыцы. Выкладчыкі прымаюць удзел у арганізацыі Рэспубліканскай летняй навукова-даследчай школы настаўнікаў і вучняў, праводзяць шматпрофільную алімпіяду па профілі фізіка. Штогод у рамках дзён адчыненых дзвярэй праводзіцца школа радыёфізіка, а таксама алімпіяда па фізіцы «Абітурыент БДУ».

## Водгукі выпускнікоў



**Барыс КАНЦАВЫ, выпускнік ФРКТ 1985 года. Першы выхадзец з Беларусі ў Тэхнічным савеце Forbes.**

Барыс Канцавы ў 1995 годзе заснаваў у Мінску кампанію Intetics, аўтсорс-распрацоўшчыка праграмных рашэнняў. Сёння ў кампаніі працуе больш за 500 чалавек, цэнтры распрацоўкі адкрыты ў Беларусі, Украіне, Польшчы. Цэнтральны офіс кампаніі размешчаны ў Нэйплз (Фларыда, ЗША).

– Прыняцце ў Тэхнічны савет Forbes гаворыць пра прызнанне сусветнай тэхнічнай супольнасцю беларускага IT-бізнесу. Платформа Forbes – гэта добрая магчымасць гучней заявіць пра сябе на сусветным рынку. ФРКТ – адзін з цэнтраў IT-кадраў. Добра, што кожны год папулярнасць IT-спецыяльнасцяў расце, бо мы развіваемся настолькі хутка, наколькі нам дазваляюць установы адукацыі.



**Мікалай ЗЯНЬКЕВІЧ, старшы выкладчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, галоўны інжынер-праграміст EPAM Systems.**

– З фізікі вядома, што калі частата ўласных хістанняў супадае з частатой знешняга ўздзеяння, то ўзнікае рэзананс і ўздзеянне можа быць шматразова ўзмоцнена. Нешта падобнае, як мне здаецца, адбываецца і на нашым факультэце. Цікаўнасць і энергія студэнтаў узмацняецца энтузіязмам і вопытам выкладчыкаў – яны падладжваюцца, прыцірaюцца адзін да аднаго, а затым пачынаюць працаваць на поўную моц. Такі сплаў дазваляе студэнтам атрымаць агульны фундаментальны базіс вышэйшай фізіка-тэхнічнай адукацыі, а таксама практычныя навыкі, запатрабаваныя як у Беларусі, так і за мяжой, а выкладчыкі змушаны працягваць самаадукацыю і развівацца разам са сваімі вучнямі.

# Факультэт сацыякультурных камунікацый






Дэкан – кандыдат педагагічных навук Алеся Генадзьеўна ПРАХАРЭНКА

Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5

Тэл. 209-59-11, 209-59-08

E-mail: fsc@bsu.by

www.fsc.bsu.by

## ФСК – гэта прастора камунікацый, крэатыўная адукацыя і міждысцыплінарныя даследаванні

Факультэт сацыякультурных камунікацый (да 9 сакавіка 2015 г. – гуманітарны факультэт) быў створаны 11 сакавіка 2004 г. ФСК прапануе сваім студэнтам атрымліваць наватарскія прафесіі, запатрабаваныя і ў сучаснасці, і ў будучыні.

**240** усяго выкладчыкаў

**1200** студэнтаў

**9** дактароў

**65** кандыдатаў навук

### СТРУКТУРА

Функцыянуюць 11 кафедраў: дызайну моды, інфармацыйных тэхналогій, камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі, камунікатыўнага дызайну, культуралогіі, мастацтваў і дызайну асяроддзя, нямецкай мовы, тэорыі і практыкі перакладу, экалогіі чалавека, кафедра англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, кафедра англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў. Працуе больш за 240 выкладчыкаў, з іх больш за 30 % маюць навуковую ступень ці званне. Сярэдні ўзрост выкладчыкаў – 47 гадоў. Навучаецца больш чым 1200 студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

**Дызайн**

- **Дызайн (напрамак – камунікатыўны).** Тэрмін навучання – 5 гадоў. Кваліфікацыя спецыяліста: *Дызайнер*. Школа камунікатыўнага дызайну, якая склалася і існуе на кафедры на працягу многіх гадоў, цалкам кіруецца арыгінальнай канцэпцыяй падрыхтоўкі дызайнераў, заснаванай на метадалогіі праектна-творчага мыслення і мастацка-кампазіцыйнага майстэрства дызайнера. Выпускнікі кафедры валодаюць уменнем аб'ядноўваць прынцыпы навуковай, тэхнічнай і мастацкай творчасці, самастойна вырашаць складаныя задачы, што дазваляе ім заставацца запатрабаванымі ў сучасных умовах павышанай канкурэнтнасці на рынку працы, а таксама паспяхова праяўляць сябе ў розных галінах дызайну.
- **Дызайн (напрамак – прадметна-прасторавага асяроддзя).** Тэрмін навучання – 5 гадоў. Кваліфікацыя спецыяліста: *Дызайнер*. Студэнты вывучаюць найноўшыя напрамкі дызайну і крэатыўных індустрый, тэхналогіі і канструкцыі, абсталяванне і сучаснае формаўтварэнне. На старэйшых курсах прафілізуюцца ў дызайне інтэр'еру і гарадскога асяроддзя, экспадызайне, арт-дызайне, дызайне моды. Выпускнікі працуюць у праектных кампаніях і артцэнтрах Беларусі і Еўропы.
- **Прыкладная інфарматыка (напрамак – вэб-праграмаванне і камп'ютарны дызайн).** Тэрмін навучання – 4 гады. Кваліфікацыя спецыяліста: *Інфарматык. Спецыяліст па камп'ютарным дызайне і распрацоўцы вэб-дадаткаў*. Выпускнікі напрамку – гэта спецыялісты па праектаванні, распрацоўцы, укараненні і суправаджэнні сучасных вэб-дадаткаў. Яны здольныя ствараць сучасны дызайн інтэрнэт-праектаў на базе развітых графічных дадаткаў, уключаючы віртуальныя 3D-мадэлі; рэалізоўваць усебаковыя вэб-распрацоўкі інтэрнэт-рэсурсаў, уключаючы кліенцкую і серверную кампаненту, а таксама ствараць мабільныя гульні і вэб-дадаткі. Выпускнікі працуюць у розных IT-кампаніях, а таксама ў арганізацыях, якія выкарыстоўваюць IT-тэхналогіі.
- **Культуралогія (напрамак – прыкладная).** Спецыялізацыі: менеджмент рэкламы і сувязяў з грамадскасцю; менеджмент міжнародных культурных сувязяў. Тэрмін навучання – 4 гады. Кваліфікацыя спецыяліста: *Культуролаг-менеджар*. Задачы спецыялістаў па сувязях з грамадскасцю – наладжванне эфектыўных камунікацый паміж працадаўцам і грамадствам. Выпускнікі могуць працаваць спецыялістамі па сувязях з грамадскасцю (PR) у дзяржаўных органах і прыватных структурах, у турыстычным бізнесе, музейных установах, у рэкламных і PR-агенцтвах, спецыялістамі ў галіне міжнародных культурных сувязяў, кіраўнікамі ўстановамі культуры, арт-менеджменту.

**Сучасныя замежныя мовы**

- **1. Сучасныя замежныя мовы (напрамак – выкладанне).** Спецыялізацыі: камп'ютарная лінгвістыка, камп'ютарнае навучанне мовам. Тэрмін навучання – 5 гадоў. Кваліфікацыя: *Лінгвіст. Выкладчык дзвюх замежных моў (з указаннем моў)*. Для Беларусі спецыяльнасць з'яўляецца ўнікальнай. Разам з вывучэннем дзвюх замежных моў (англійскай і нямецкай/іспанскай) студэнты атрымліваюць веды па фармалізацыі любой прыроднай мовы, якія дазваляюць забяспечыць дыялог чалавека з камп'ютарам, а таксама зрабіць магчымым стварэнне сістэм штучнага інтэлекту. Студэнты таксама вывучаюць асновы праграмавання (Python), што яшчэ больш пашырае іх магчымасці атрымаць актуальную і годную працу. Выпускнікі працуюць у розных адукацыйных і навуковых установах, IT-кампаніях, вытворчай сферы.
- **2. Сучасныя замежныя мовы (напрамак – пераклад).** Тэрмін навучання – 5 гадоў. Кваліфікацыя спецыяліста: *Лінгвіст, перакладчык (з указаннем моў)*. У абавязкі перакладчыка ўваходзіць: арганізацыя і правядзенне экскурсій па культурна-гістарычных мясцінах для замежных грамадзян, суправаджэнне іх падчас візітаў у краіну, пераклады на прэзентацыях, дзелавых сустрэчах, суправаджэнне рускамоўных груп пры паездках за мяжу, пераклад літаратуры. Выпускнікі працуюць у вядомых міжнародных кампаніях.

### МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

У рамках дамоў з 5 замежнымі навуковымі і адукацыйнымі ўстановамі ажыццяўляецца абмен вопытам, праводзяцца стажыроўкі, арганізоўваюцца канферэнцыі, а таксама ўзаемныя візіты і чытанне лекцый. Студэнты маюць магчымасць прымаць удзел у праграме Erasmus+. Факультэт вядзе падрыхтоўку студэнтаў з 7 замежных краін.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Больш за 40 % студэнтаў удзельнічаюць у навуковых даследаваннях. Функцыянуюць крэатыўная лабараторыя дызайну, студэнцкія даследчыя гурткі «Лабірынт» і «CL&L», студэнцкі клуб «Litera», клуб прафесійнага самаразвіцця «Фенікс», СНДЛ «Камп'ютарны дызайн», а таксама «Школа валанцёраў».

### ЖЫЦЦЁ ФАКУЛЬТЭТА

Маладыя таленты факультэта з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі розных творчых праектаў. Многія сталі лаўрэатамі шматлікіх конкурсаў, выстаў і фэстаў. З рэалізацыі праекта «Падзяліся цяплом душы сваёй» у 2005 г. пачаўся добраахвотніцкі рух. З 2009 г. на факультэце развіваецца спартыўны напрамак. Студэнты ўдзельнічаюць практычна ва ўсіх міжнародных спартыўных турнірах.

## Водгукі выпускнікоў



**Аляксандра ГАЛЫШКА, кіраўнік аддзела рэкламы і спецпраектаў у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. Выпускніца 2021 г. спецыяльнасці магістратуры «Культуралогія» (прафілізацыя «Культурныя індустрыі»).**

– Культуралогія – гэта ўнікальная магчымасць атрымаць шырокую базу ведаў ад найлепшых выкладчыкаў і сапраўдных прафесіяналаў. Самае каштоўнае, чаму я тут навучылася, – думаць. Задаваць пытанні і шукаць на іх адказы.

Вучоба тут не з'яўляецца вучобай у яе класічным разуменні. Гэта пастаянны дыялог з выкладчыкамі, удзел у творчых праектах і даследаваннях. Усё, каб атрымаць вышэйшую адукацыю і стаць кваліфікаваным спецыялістам.



**Кацярына ВАРАБ'ЁВА, сузаснавальнік акадэміі дадатковай адукацыі для дзяцей «Mr. Cat Academy». Выпускніца 2018 г. спецыяльнасці «Сучасныя замежныя мовы (выкладанне)».**

– Чэрвень, 2018. «Ціха, ідзе дзяржаўны экзамен!» Здалі... Ці здаў? Калі б вымяральнік душэўных сіл выглядаў як градуснік, мае сілы былі б на самай нізкай адзнацы... «Выпускны баль студэнтаў». Стаю на сцэне, у руках статуэтка «Найлепшы выпускнік». Кажу прамову, загадзя ведаючы: слоў занадта мала, каб апісаць пачуцці ўнутры. А глядзяць і слухаюць усё тыя ж унікальныя, цёплыя, родныя. Вельмі кароткая гісторыя пяці выдатных гадоў. За час навучання ва ўніверсітэце стала ясна: не варта ісці ва ўніверсітэт выключна па веды. Пастаянна знаходзячыся ў моры інфармацыі, мы назапашваем іх у сабе, самі таго не заўважаючы. Універсітэт – гэта магчымасць прапусціць веды скрозь сябе, увабраць вопыт, навучыцца думаць, бачыць па-іншаму, чуць іншых; знайсці сябе і сваіх людзей, раскрыць і рэалізаваць свой патэнцыял. Выбіраць заўсёды нялёгка. Але, калі выбіраеш БДУ, верагоднасць памылкі памяншаецца ў разы.

# Факультэт філасофіі і сацыяльных навук










Дэкан – кандыдат філасофскіх навук дацэнт Вераніка Святаславаўна САЙГАНАВА

Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9

Тэл. 259-70-47

E-mail: phse@bsu.by

www.ffsn.bsu.by

**ФФСН арганічна складаецца з трох класічных спецыяльнасцяў: філасофіі, сацыялогіі і псіхалогіі, а таксама досыць новых – сацыяльных камунікацый і сацыяльнай работы**

У структуры факультэта 7 кафедраў і 2 навучальныя лабараторыі. У нас працуюць вядучыя навукоўцы-гуманітарыі Беларусі. З лекцыямі прыязджаюць замежныя эксперты.

Навучаецца каля 1500 студэнтаў, 142 магістранты, 40 аспірантаў дзённай і завочнай формаў навучання, а таксама 10 дактарантаў.

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

- **«Філасофія».** Кваліфікацыя *«Філасаф. Выкладчык філасофіі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін»*. Спецыялізацыі: сацыяльная філасофія, гісторыя філасофіі, этыка, антрапалогія.
- **«Сацыялогія».** Кваліфікацыя *«Сацыёлаг. Выкладчык сацыялогіі і сацыяльна-палітычных дысцыплін»*. Спецыялізацыі: сацыялогія кіравання, метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання, палітычная сацыялогія.
- **«Псіхалогія».** Кваліфікацыя *«Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі»*. Спецыялізацыі: сацыяльная псіхалогія, медыцынская псіхалогія.
- **«Сацыяльныя камунікацыі».** Кваліфікацыя *«Спецыяліст па сацыяльных камунікацыях»*. Спецыялізацыі: арганізацыйныя камунікацыі, масавыя камунікацыі, маркетынгавыя камунікацыі.
- **«Сацыяльная работа»** (па напрамках: сацыяльнае праектаванне, сацыяльна-псіхалагічная дзейнасць, сацыяльна-рэабілітацыйная дзейнасць). Кваліфікацыі *«Спецыяліст па сацыяльнай рабоце і кіраванні праектамі»*. *«Спецыяліст па сацыяльнай рабоце-псіхолаг»*. *«Спецыяліст па сацыяльнай рабоце-рэабілітолаг»*.
- **«Сацыяльная работа»** (напрамак – сацыяльна-рэабілітацыйная дзейнасць). Кваліфікацыя *«Спецыяліст па сацыяльнай рабоце-рэабілітолаг»*.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі факультэта ўсіх спецыяльнасцяў працуюць у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, органах дзяржаўнага кіравання, навуковых і адукацыйных цэнтрах, камерцыйных структурах, грамадскіх аб'яднаннях, СМІ, рэкламных і кадравых агенцтвах.

### СУВЯЗЬ З ПРАКТЫКАЙ

Базавымі партнёрамі факультэта выступаюць вядучыя навукова-адукацыйныя і вытворчыя цэнтры. Сярод іх Інстытут філасофіі, Інстытут сацыялогіі і Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, Нацыянальны прэсцэнтр Рэспублікі Беларусь, Мінскі гарадскі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей і іншыя.



**1500** студэнтаў

**150** усяго выкладчыкаў

**2** члены-карэспандэнты

**21** доктар

**80** кандыдатаў навук

### МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук развівае адукацыйныя і навуковыя сувязі з вядучымі ўніверсітэтамі Англіі, Іспаніі, Італіі, Германіі, Швецыі, Фінляндыі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Польшчы, Расіі, ЗША, Украіны, Францыі, Кітая. Студэнты і выкладчыкі рэгулярна ўдзельнічаюць у міжнародных праграмах акадэмічнай мабільнасці ERASMUS+ і Copernicus. На факультэце праводзяцца адборачныя туры міжнароднай алімпіяды па філасофіі і міжнароднага Балтыйскага конкурсу эсэ па філасофіі на англійскай мове пры падтрымцы Міжнароднай асацыяцыі філасофскіх грамадстваў і UNESCO.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Дзейнічаюць студэнцкая навуковая лабараторыя «Соцыум», студэнцкае навуковае таварыства, філасофскі кінаклуб, міждысцыплінарны навукова-тэарэтычны семінар «Інавацыйныя стратэгіі ў сучаснай сацыяльнай філасофіі», псіхалагічная студыя, а таксама праводзіцца навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў «Чалавек. Культура. Грамадства».

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі ФФСН размяркоўваюцца ў вядучыя дзяржаўныя і камерцыйныя арганізацыі нашай краіны. Сярод іх НАН Беларусі, вядучыя ВНУ Беларусі, дзяржаўныя тэлевізійныя каналы, адукацыйна-аздараўленчыя цэнтры, абласныя і раённыя выканаўчыя камітэты, кампаніі «Белавія», «Атлант-М», дзяржаўныя ўстановы адукацыі і аховы здароўя, рэкрутынгавыя агенцтвы, Wargaming і іншыя.

### СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Факультэт славіцца сваім студэнцкім грамадскім жыццём. Наш дэвіз – давяраць студэнтам! Студэнцкае самакіраванне з'яўляецца асновай выхаваўчай работы на нашым факультэце.

Мноства навуковых, культурных, спартыўных і грамадскіх мерапрыемстваў, якія складаюць традыцыі факультэта, заслужылі аўтарытэт і вядомасць на ўніверсітэцкім, рэспубліканскім і міжнародным узроўнях. Самыя папулярныя з іх – турзлёт ФФСН, дзень першакурсніка, дзень нараджэння факультэта, фэст кароткаметражнага кіно SINOPSIS, «Містар» і «Міс ФФСН».

### ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

Асноўнымі напрамкамі прафарыентацыйнай працы факультэта з'яўляюцца заняткі для школьнікаў старэйшых класаў у школе юнага філасофа «Пайдэя», школе юнага сацыёлага, штогадовая віктарына для школьнікаў «Першы крок у прафесію» і адукацыйна-прафарыентацыйныя праекты «Майстар-класы кафедры сацыяльных камунікацый», Workshop Philosophy і іншыя.

**ФФСН ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў у галіне філасофіі, сацыялогіі і сферы сацыяльнай камунікацыі, адзіны ў БДУ, які аб'ядноўвае псіхолагаў розных напрамкаў.**

## Водгукі выпускнікоў



**Аляксандр МАМОШКА, аспірант, тэхнаблогер.**

– Вучоба на ФФСН, 4 гады на спецыяльнасці «Сацыялогія» і 1 год вывучэння ў магістратуры «Камунікатыўнага менеджменту» далі мне велізарную базу ведаў і досведу. Факультэт прыцягвае самых розных, цікавых і яркіх маладых людзей. Кожны курс – абсалютна ўнікальная з'ява, непадобная ні да чаго іншага. Навуковы працэс на факультэце вельмі разнастайны. Адміністрацыя і выкладчыкі кафедраў цалкам заахвочваюць удзел у навуковым і грамадскім жыцці факультэта, універсітэта і краіны. Магу сказаць, што мне пашанцавала з аднагрупнікамі, мы дагэтуль збіраемся на навуковыя дыскусіі.



**Аліна РАМАНОВІЧ, спецыяліст па ўнутраных камунікацыях у кіраўнічай кампаніі холдынгу «Мостра-груп».**

– Факультэт філасофіі і сацыяльных навук – гэта найцікавейшая адукацыя на працягу ўсіх гадоў. Я скончыла факультэт па спецыяльнасці «Сацыяльныя камунікацыі» і магістратуру («Камунікацыя»). Факультэт даў мне ўсе магчымасці, каб праявіць сябе, рэалізавацца ў вучобе, навуцы, творчасці і дасягнуць поспехаў. Факультэт вылучаецца высокай згуртаванасцю студэнтаў і выкладчыкаў. Студэнты факультэта – гэта цэлая сям'я, якая не толькі даведваецца кожны дзень штосьці новае, але і разам расце, развіваецца і змяняе свет да лепшага.

# Фізічны факультэт

Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Міхаіл Сяргеевіч ЦІВАНАЎ

Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 2

Тэл. 209-52-67, 209-51-15

E-mail: physdean@bsu.by

www.physics.bsu.by










## Наша адукацыя дазваляе выпускнікам лёгка адаптавацца да працы не толькі па фізіка-тэхнічным профілі, але і ў іншых галінах (арганізацыйнай, фінансавай, камерцыйнай)

У складзе факультэта 11 кафедраў, 10 НДЛ, 5 студэнцкіх НДЛ, навучальна-навуковы цэнтр па нанаматэрыялах і нанатэхналогіях, астранамічная лабараторыя, цэнтр калектыўнага карыстання ўнікальным навуковым абсталяваннем.

**157** усяго выкладчыкаў
**1** акадэмік
**2** члены-карэспандэнты
**27** дактароў
**89** кандыдатаў навук
**685** студэнтаў

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

- **«Фізіка»**, у межах якой напрамкі: навукова-даследчы (кваліфікацыя – *«Фізік. Даследчык»*), вытворчы (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*) у рамках Сумеснага інстытута Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта (Кітай) (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*),
- **«Фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*),
- **«Ядзерныя фізіка і тэхналогіі»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*),
- **«Камп'ютарная фізіка»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Праграміст»*).

На другім курсе студэнты размяркоўваюцца па спецыялізацыях: камп'ютарнае мадэляванне фізічных працэсаў, фізічная інфарматыка, фізічныя метады пераўтварэння інфармацыі, тэарэтычная фізіка, біяфізіка, нанабіяматэрыялы і нанабіятэхналогіі, лазерная фізіка і спектраскапія, нанафатоніка, фізічная оптыка, функцыянальныя нанаматэрыялы, нанаэлектроніка, фізіка паўправаднікоў і дыэлектрыкаў, энергафізіка, рацыянальная энергетыка, ядзерная фізіка і электроніка, фізіка ядзерных рэактараў і атамных энергетычных установак, ядзерная бяспека, радыяцыйнае матэрыялазнаўства.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Акрамя фундаментальнай падрыхтоўкі па фізіцы і матэматыцы, асаблівая ўвага надаецца сучасным камп'ютарным тэхналогіям і інфарматыцы. Штогод частка нашых выпускнікоў размяркоўваецца па заяўках вядучых камп'ютарных кампаній: СП ЗАТ «Міжнародны дзелавы альянс» (больш вядомае як IBA), EPAM Systems, ААТ «АМПсофт», ЗТАА «Эксадэл», ЗАТ «Ітранзішн» і інш.

Нашы выпускнікі працуюць у НАН Беларусі, навукова-даследчых і навукова-вытворчых цэнтрах (напрыклад, Мінскі НДІ радыёматэрыялаў Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта), канструктарскіх бюро (напрыклад, «КБТЭМОМО» ДНВА дакладнага машынабудавання «Планар»), кантралюючых структурах (напрыклад, «Дзяржатамнагляд»), фірмах рознага профілю.

### СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Кафедры факультэта ажыццяўляюць супрацоўніцтва і абмен навукова-тэхнічнай інфармацыяй з шэрагам інстытутаў НАН Беларусі, ААТ «Інтэграл», НПДК парашковай металургіі, НДЦ «Плазматэг», НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі і НДІ ядзерных праблем БДУ, БДУІР, РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, РНПЦ «Кардыялогія», РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, ЗАТ «Амкадор-Унікаб», ТАА «Квалітэт», а таксама іншымі навуковымі і вытворчымі цэнтрамі.

### МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Факультэт супрацоўнічае з ВНУ і іншымі арганізацыямі Расіі, Украіны, Казахстана, Германіі, Іспаніі, Чэхіі, Польшчы, Даніі, Турцыі, Літвы, Францыі, Сербіі, Італіі, В'етнама, Японіі, Балівіі, Латвіі, Азербайджана. Супрацоўнікі ўдзельнічаюць у выкананні міжнародных праектаў па праграмах АІЯД, ERASMUS+, міжнародных грантах БРФФД, 2 праектах у рамках праграмы Horizon 2020. Стажыроўкі ажыццяўляюцца пры падтрымцы грантаў універсітэтаў-партнёраў, а таксама фонду DAAD (Германія) і інш.

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Студэнты старэйшых курсаў удзельнічаюць у працы міжкафедральных СНДЛ «Нелінейная дынаміка фізічных сістэм», «Біяфізіка і клетачныя тэхналогіі», «Фізіка нанаструктураваных паўправаднікоў», «Мадыфікацыя ўласцівасцяў матэрыялаў з дапамогай кампрэсійных і іоннаплазменных струменяў» і «Танкаплёначныя тэхналогіі» (сумесна з ТАА «Ізавак»). Для студэнтаў першага і другога курсаў працуюць навуковыя гурткі на кафедрах біяфізікі, ядзернай фізікі (гурток радыёэлектронікі), тэарэтычнай фізікі і астрафізікі.

Студэнцкае жыццё на факультэце характарызуецца не толькі вучобай і магчымасцямі правядзення ўнікальных навуковых эксперыментаў. Праводзяцца вечарыны першакурсніка, свята «Дні фізіка», турысцкі злёт, турнір па кіберспорце, конкурс «Міс фізфака», «Факультэцыя гульні» і шматлікае іншае.

## Водгукі выпускнікоў



**Максім БАГДАНОВІЧ, дырэктар ДНУ «Інстытут фізікі імя Б. І. Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», выпускнік фізічнага факультэта 2003 г.**

– Фізічны факультэт – гэта не толькі выдатная магчымасць атрымаць добрую адукацыю ў адным з самых перадавых і аўтарытэтных цэнтраў фізічнай навукі, але і месца з асаблівай творчай атмасферай. Навучаючыся на факультэце, ты становішся часткай вялікай супольнасці аднадумцаў з ясным разуменнем з'яў навакольнага свету і жаданнем спасцігаць сутнасць працэсаў, што адбываюцца. Адмысловае месца на фізічным факультэце займаюць традыцыі, якія сфарміраваліся за шматлікія дзесяцігоддзі яго існавання, у аснове якіх ляжаць узаемапавага паміж студэнтамі і выкладчыкамі і спецыфічнае пачуццё гумару, уласцівае ўсім фізікам.



**Канстанцін КАЗАДАЕЎ, прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі, выпускнік фізічнага факультэта 2005 г.**

– Калі я прыйшоў у 2000 г. на фізфак са звычайнай сярэдняй школы невялікага беларускага гарадка, ён здаўся мне іншай планетай – планетай Фізікі. Само паняцце «фізік» заіграла тут новымі фарбамі, набыло элітарны глянец. Лічу, што асноўны капітал фізфака – гэта выкладчыкі. Гэтыя людзі надзвычайнага інтэлекту і нязменнай інтэлігентнасці ўмеюць фарміраваць патрабаваныя веды, не навязваючы іх, а хутчэй падахвочваючы навучэнца да іх набыцця. Фізфак навучыў мяне думаць і даказваць свой і прымаць чужыя пункты гледжання, не баяцца эксперыменту і вельмі адказна ставіцца да тэхнікі бяспекі – і шмат чаму іншаму, што ў суме называецца «быць навукоўцам».



**Аляксей КОСЦІН, кіраўнічы партнёр групы кампаній Solvedis, выпускнік фізічнага факультэта 1998 г.**

– Рэальна паспяховы выпускнік фізфака валодае высокім узроўнем адаптацыйнасці, узроўнем IQ вышэйшым за сярэдні, добрымі навыкамі падачы інфармацыі. Стартавыя магчымасці, атрыманыя на факультэце, з'яўляюцца падмуркам для дасягнення поспеху ў розных відах дзейнасці, што выдатна пацвярджаецца жыццёвымі прыкладамі. Выпускнікі майго пакалення, якія скончылі фізфак каля 20 гадоў назад, сталі паспяховымі навукоўцамі, вядомымі бізнесменамі і банкірамі, топ-менеджарамі ў буйных камерцыйных і дзяржаўных структурах у некалькіх краінах, аўтарытэтнымі спецыялістамі ў розных галінах прамысловасці і IT. Галоўнае, што дасць вам фізфак, – гэта базу, на падставе якой, прыклаўшы высілкі, вы зможаце дасягнуць многага.

# Філалагічны факультэт

Дэкан – кандыдат філалагічных навук дацэнт Сяргей Аляксандравіч ВАЖНІК

Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31

Тэл. 379-36-21, 363-96-02

E-mail: phyl@bsu.by

www.philology.bsu.by









Філфак – гэта alma mater класікаў беларускай літаратуры; таямніцы славянскіх, заходнееўрапейскіх, усходніх моў, літаратур і культур; камп'ютарныя тэхналогіі ў філалогіі; віртуознае валоданне словам у сферы літаратурнага рэдагавання і дзелавой камунікацыі

**260** усяго выкладчыкаў
**1400** студэнтаў
**25** дактароў
**102** кандыдаты навук

Дзейнічаюць 14 кафедраў, 12 спецыялізаваных кабінетаў (беларускай, рускай, польскай, украінскай, чэшскай, славацкай, сербскай, нямецкай, італьянскай, кітайскай, грэчаскай і інш. філалогій), 25 мультымедыйных аўдыторый, 5 лінгафонных кабінетаў, а таксама вучэбны цэнтр інфармацыйных тэхналогій.

2 лістапада 2018 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё вучэбнай аўдыторыі інавацыйнага навучання «Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі». 8 з 17 народных паэтаў і пісьменнікаў Беларусі вучыліся і працавалі на філалагічным факультэце.

## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

• **Беларуская філалогія** (напрамкі: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць, камп'ютарнае забеспячэнне, дзелавая камунікацыя). У залежнасці ад напрамку прысвойваецца наступная кваліфікацыя: *«Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік. Спецыяліст па камп'ютарнай філалогіі. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі»*.

• **Руская філалогія** (напрамкі: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць, камп'ютарнае забеспячэнне, дзелавая камунікацыя, руская мова як замежная). У залежнасці ад напрамку прысвойваецца наступная кваліфікацыя: *«Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік. Спецыяліст па камп'ютарнай філалогіі. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі. Выкладчык рускай мовы як замежнай»*.

• **Славянская філалогія.** Кваліфікацыя: *«Філолаг. Выкладчык славянскіх моў і літаратур (з указаннем моў і літаратур). Перакладчык»*.

• **Рамана-германская філалогія.** Кваліфікацыя: *«Філолаг. Выкладчык замежных моў і літаратур (з указаннем моў і літаратур). Перакладчык»*.

• **Усходняя (кітайская) філалогія.** Кваліфікацыя: *«Філолаг. Выкладчык замежных моў і літаратур (з указаннем моў і літаратур). Перакладчык»*.

Студэнты маюць магчымасць праходзіць моўную стажыроўку ў замежных краінах. Так, напрыклад, кожны студэнт спецыяльнасці «Усходняя (кітайская) філалогія» за перыяд навучання адзін год праводзіць у адным з універсітэтаў Кітая. Ва ўмовах пандэміі такія праграмы рэалізуюцца ў тым ліку анлайн.

## ПРАКТЫКА

Студэнты праходзяць практыку ва ўстановах адукацыі рознага тыпу, а таксама на пляцоўках базавых арганізацый – Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Беларусі, Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», НПЦ Дзяржкамітэта судовых экспертыз і інш.

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

Функцыянуе вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору. Сабраны найбагацейшыя ў краіне архівы песень, казак, прыказак і прымавак, якімі карыстаюцца не толькі даследчыкі, але і творчыя калектывы. Удзельнікі студэнцкай НДЛ фальклору і этнакультуралогіі неаднаразова атрымлівалі гранты на правядзенне даследаванняў.

## СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Нашы дасягненні:

• І месца ў намінацыі «Найлепшая суполка ў сацыяльнай сетцы „Укантакце"» (катэгорыя «Факультэты і ўстановы адукацыі»)

• ІІ месца ў намінацыі «Найлепшая медыйная прастора БДУ»

• Пераможцы фестывалю творчасці першакурснікаў «YFM#тынавоЛне»

• «Самы творчы факультэт БДУ – 2020, 2021» па выніках прэміі творчага саюза БДУ

• «Калядны дабрачынны баль» – лаўрэат дыплома ІІ ступені конкурсу «Найлепшы маладзевы праект БДУ»

Студэнцкія творчыя калектывы:

• Літаратурнае аб'яднанне «Альтанка»

• Гурток «Роднае слова»

• Гурток перакладчыкаў кітайскай літаратуры на беларускую і рускую мовы «对白» («Дыялог»)

• Майстэрня аўдыявізуальнага перакладу

• Лабараторыя перакладчыцкага майстэрства

• Клуб «Багатая палітра свету моў»

• Школа маладога даследчыка-лінгвіста

• СНДЛ «Фалькларыстыка» і «Нацыянальнае і ўніверсальнае ў сусветнай літаратуры»

• Фальклорна-этнаграфічны калектыў «Багач»

• Харавая камерная капэла «Belcoro»

• Дыскусійны клуб «English Speaking Club»

Злёт студэнтаў на малой радзіме народнага паэта Беларусі ў філіяле ***музея Янкі Купалы ў Вязынцы*** лічыцца галоўным святам філфака і ўсяго ўніверсітэта.

***Фестываль моў*** філалагічнага факультэта дае магчымасць наведаць шэсць 45-хвілінных мінілекцый пра 50 розных моў свету – старажытныя і сучасныя, рэдкія і распаўсюджаныя, а таксама разнастайныя захапляльныя навукова-папулярныя лекцыі на лінгвістычную тэматыку, лекцыі па беларусістыцы, моўныя гульні, лінгвістычныя задачы і г. д.

## ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

Школьнікі 8–11 класаў запрашаюцца ў «Школу юнага філолага». Будучыя філолагі сістэматызуюць свае веды па рускай і беларускай мовах і літаратурах, фальклоры; юныя кітаязнаўцы даведаюцца аб мастацтве каліграфіі і кітайскіх традыцыях; слухачы напрамкаў «італьяністыка», «германістыка», «англістыка», «раманістыка» вывучаць асновы моў і культур адпаведных краін; лаціністы азнаёмяцца з асновамі лацінскай мовы і антычнай культурай; школа юнага блогера будзе карысная тым, каго цікавіць літаратура ў медыякультуры.

Запрашаюцца ўсе ахвотныя навучэнцы школ, гімназій і ліцэяў. Навучанне бясплатнае. Для запісу неабходна папярэдне запоўніць заяву на сайце *http://philology.bsu.by*

## Водгукі выпускнікоў



**Алена КІТАЕВА, выпускніца 2010 года, перакладчык у Пасольстве Сербіі ў Мінску, выкладчыца сербскай мовы.**

– Больш за 16 гадоў я звязана з любай Сербіяй, і ўсё дзякуючы філалагічнаму факультэту. Сербістаў рыхтуюць толькі ў БДУ, мы рэдкія спецыялісты, і тым з нас, хто паказваў поспехі ў вывучэнні мовы, давалі магчымасць перакладаць на фестывалях, выставах, сустрэчах у фармаце B2B, хтосьці зацікавіўся перакладам літаратурных твораў. Таксама мы бралі ўдзел у мерапрыемствах, якія ладзіць Пасольства Сербіі, нават дыпламатычных прыёмах! Зараз я працую перакладчыкам, але пачынала я з выкладання мовы, і гэта быў важны для мяне досвед. Сербы з цеплынёй ставяцца да беларусаў, лічаць нас сваімі братамі.



**Анатоль БУТЭВІЧ, пісьменнік, член Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, ганаровы грамадзянін Нясвіжа. Выпускнік 1971 г.**

– Лекцыі, практычныя заняткі, літаратурнае аб'яднанне, студэнцкія будаўнічыя атрады, цаліна, грамадскія клопаты, шматлікія імпрэзы ў Саюзе пісьменнікаў з удзелам некалі недасяжных для нас Івана Шамякіна, Івана Мележа, Максіма Танка, супраца з Енскім універсітэтам Германіі – усяго і не пералічыш. Мо і таму многія і многія нашы выпускнікі (і не толькі нашы) змаглі пасля філфака працаваць на самых розных пасадах і дабівацца ўсюды шыкоўных вынікаў. Так што філфак – гэта ўніверсальныя веды, універсальная школа жыцця, універсальная кузня кадраў для многіх сфер. Таму я ўдзячны лёсу, што ён прывёў мяне на філфак, што даў такую надзейную пуцёўку ў жыццё, з якой я дагэтуль не магу (і не хачу) расстацца. Высокія словы? Хай сабе, але праўдзівыя і сапраўды шчырыя. І таму – О, мой філфак, як ты мне мілы...

# Хімічны факультэт





Хімічны факультэт з'яўляецца вядучым вучэбна-навуковым цэнтрам па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў

**СТРУКТУРА ФАКУЛЬТЭТА**

Дзейнічае 8 кафедраў. Навучаецца больш чым 770 студэнтаў і звыш 35 аспірантаў.

Факультэт з'яўляецца ядром хімічнага кластара БДУ, у які таксама ўваходзіць НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ, тэхнапарк БДУ «Унітэхпрам» і прадпрыемства БДУ «Унікаштмет». Факультэт таксама плённа супрацоўнічае з інстытутамі НАН Беларусі, дзе створаны філіялы кафедраў факультэта і арганізаваны спецыялізаваныя практыкумы. Там студэнты знаёмяцца з перадавымі даследаваннямі, выконваюць курсавыя і дыпломныя працы, удзельнічаюць у выкананні навуковых тэм.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

Арганізавана падрыхтоўка па высокатэхналагічных спецыяльнасцях:

- **«Фундаментальная хімія»,**
- **«Хімія высокіх энергій»,**
- **«Хімія лекавых злучэнняў»,**
- **«Хімія»** (па напрамках «Навукова-вытворчая дзейнасць», «Навукова-педагагічная дзейнасць», «Фармацэўтычная дзейнасць»).

У залежнасці ад абранай спецыяльнасці выпускнікі атрымліваюць адну з кваліфікацый: *«Хімік. Даследчык», «Хімік. Радыяцыйны хімік. Радыяхімік», «Хімік. Біяфармахімік», «Хімік. Інжынер», «Хімік. Выкладчык хіміі», «Хімік. Хімік-фармацэўт»*. Навучальны працэс на хімічным факультэце скіраваны на развіццё творчага патэнцыялу студэнтаў, уменне самастойна будаваць сваю адукацыйную траекторыю, пастаянна папаўняць і абнаўляць свае прафесійныя кампетэнцыі.

**МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ**

Навучальны працэс на хімічным факультэце адпавядае сусветным адукацыйным стандартам, у чым студэнты пераконваюцца, трапляючы на стажыроўку ў вядучыя замежныя ўніверсітэты і навучальныя цэнтры. Штогод шэраг студэнтаў хімічнага факультэта накіроўваецца на стажыроўку за мяжу па праграмах «Эразмус+», Дзяржаўнай праграме падрыхтоўкі спецыялістаў для ядзернай энергетыкі і інш.

На хімічным факультэце на англійскай мове чытаюць лекцыі прафесары з Аўстрыі, Італіі, Польшчы, Чэхіі, Венгрыі, а таксама запрашаюцца лектары з вядучых універсітэтаў і навуковых інстытутаў Расіі. Падчас летніх вакацый студэнты ўдзельнічаюць у праграме летніх міжнародных студэнцкіх практык IAESTE (The International Association of the Exchange of Students for Technical Experience) і працуюць у даследчых цэнтрах і ўніверсітэтах Еўропы. На хімічным факультэце ў навучальнай праграме ёсць адзіны ў краіне



білінгвальны курс «Уводзіны ў зялёную хімію», які дазваляе студэнтам не толькі авалодаць стратэгіяй і тактыкай хімічных сінтэзаў, бяспечных для навакольнага асяроддзя і чалавека, але і ўдасканальваць навыкі валодання пісьмовай і гутарковай англійскай мовай.

**125** усяго выкладчыкаў

**770** студэнтаў

**1** акадэмік

**2** члены-карэспандэнты

**16** дактароў

**65** кандыдатаў навук

**СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА**

Каб працэс навучання быў эфектыўным і займальным, для студэнтаў укаранёныя розныя інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі: кааператыўны метад навучання, лекцыйны падкастынг, дыстанцыйнае навучанне на платформе MOODLE. Студэнты спецыяльнасці «Хімія высокіх энергій» выконваюць лабараторныя працы ў інтэрнэт-лабараторыі ў рэжыме відэаканферэнцыі на даследчым рэактары, які размешчаны ў Францыі.

**СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ**

На факультэце штогод праводзіцца шмат мерапрыемстваў з удзелам студэнтаў, у тым ліку дні гісторыі навукі і студэнцкая алімпіяда, розныя конкурсы і канцэрты. І кожную вясну факультэт дружна святкуе сваё галоўнае свята – Дзень хіміка. Студэнты-хімікі рэалізуюць шмат праектаў і ініцыятыў: арганізоўваюць аднадзённыя стажыроўкі ў



фармацэ Shadowday, папулярызуюць навуку ў рамках праектаў «Віртуозы навукі БДУ» і «Экастыль БДУ», удзельнікі «школы экскурсавода-прафарыентолага» праводзяць школьнікам інтэрактыўныя рознафарматныя экскурсіі, арганізоўваюць Міжнародны студэнцкі экалагічны кангрэс і інш.

**ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ**

Выпускнікі хімфака маюць шырокія магчымасці ў выбары сваёй прафесійнай дзейнасці. Яны могуць працаваць у інжынерных і даследчых цэнтрах прадпрыемстваў, інстытутах НАН Беларусі, хімічных лабараторыях буйных прамысловых аб'яднанняў фармацэўтычнай, хімічнай і радыёэлектроннай прамысловасці, на Беларускай АЭС, у Нацыянальнай антыдопінгавай лабараторыі, Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз, навукова-практычных медыцынскіх цэнтрах, уключаючы Рэспубліканскі цэнтр пазітронна-эмісійнай тамаграфіі (ПЭТ-цэнтр), на фармацэўтычных прадпрыемствах – усюды, дзе выкарыстоўваюцца хімічныя тэхналогіі. Тыя, хто схільны да выкладчыцкай дзейнасці, рэалізуюць сябе ў навучальных установах.

Нашы выпускнікі становяцца не толькі буйнымі навукоўцамі і арганізатарамі вытворчасці, але і прадпрымальнікамі, дыпламатамі, крыміналістамі, менеджарамі, а гэта значыць, што яны лёгка ўваходзяць у іншыя сферы дзейнасці і дасягаюць у іх значных поспехаў. Мы чакаем вас на хімічным факультэце. Вы не пашкадуеце, калі прыйдзеце вучыцца да нас!

**Хімічны факультэт – адзіная арганізацыя ў нашай краіне, дзе рыхтуюць хімікаў-універсалаў, здольных распрацоўваць і ўкараняць хімічныя тэхналогіі VI тэхналагічнага ўкладу, ствараць новыя матэрыялы і лекавыя рэчывы.**

**Наш лозунг –**
**ТУТ СТВАРАЕЦЦА БУДУЧЫНЯ!**

Дэкан – доктар хімічных навук прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Дзмітрый Вадзімавіч СВІРЫДАЎ

Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14

Тэл.209-52-53

E-mail: chem@bsu.by

www.chemistry.bsu.by

## Водгукі выпускнікоў



**Андрэй РОГАЧ, дырэктар Цэнтра функцыянальнай фатонікі Універсітэта Ганконга, уваходзіць у дзясятку самых цытаваных навукоўцаў у галіне хіміі і фізікі нанакрышталяў. Выпускнік 1978 года.**

– На хімфаку БДУ заўсёды працавалі бліскучыя выкладчыкі, якія далі нам выдатную, сапраўды ўніверсітэцкую, адукацыю і, галоўнае, фундаментальныя веды не толькі ў галіне хіміі, але таксама ў фізіцы і матэматыцы. Асабіста мне гэта дазволіла пасля абароны кандыдацкай дысертацыі на кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта БДУ з поспехам будаваць сваю навуковую кар'еру ўжо на фізічным факультэце Мюнхенскага ўніверсітэта, працуючы ў такой перадавой галіне даследаванняў, як фатоніка паўправадніковых нанаструктур.



**Ксенія і Канстанцін ЛЯБЕЦКІЯ, інжынеры-хімікі БелАЭС. Выпуск 2017 г.**

*Ксенія:* «Выпускнікоў хімічнага факультэта на галоўным энергетычным прадпрыемстве краіны шануюць за выдатную падрыхтоўку ў галіне фундаментальных навук і ўменне ўжыць гэтыя веды на практыцы. Хімфак даў нам базавую і спецыяльную падрыхтоўку ў розных галінах хіміі, і таму цяпер, у адказны момант уводу станцыі ў экс-плуатацыю, мы пачуваемся ўпэўнена».

*Канстанцін:* «Падчас навучання на хімфаку мы прайшлі стажыроўку ў навучальных цэнтрах Расіі, Славакіі, Балгарыі, Аўстрыі і сталі сапраўднымі спецыялістамі. Яшчэ больш важнае тое, што ў нас вучыліся самыя прыгожыя дзяўчаты – і тут я знайшоў сваё каханне».

# Эканамічны факультэт

Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Ганна Анатольеўна КАРАЛЁВА

Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31

Тэл. 378-67-25

E-mail: economy@bsu.by

www.economy.bsu.by







## Эканамічны факультэт БДУ – гэта ўнікальнае спалучэнне фундаментальных і прыкладных дысцыплін у галіне эканомікі і фінансаў

Тут навучаюцца каля 1700 студэнтаў і магістрантаў, у тым ліку 490 замежных грамадзян з 16 краін.

На 7 кафедрах працуюць вядомыя навукоўцы-практыкі, кіраўнікі і вядучыя спецыялісты міністэрстваў, банкаў, дзяржаўных устаноў, кансалтынгавых фірмаў. Пры кожнай кафедры маецца 1 альбо 2 філіялы ад вытворчых арганізацый, якія бяруць на працу шмат выпускнікоў.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

- **Эканоміка** (кваліфікацыя *«Эканаміст-аналітык»*),
- **Эканамічная інфарматыка** (кваліфікацыя *«Эканаміст-інфарматык»*),
- **Фінансы і крэдыт** (напрамкі «Фінансы» і «Банкаўская справа», кваліфікацыя *«Эканаміст»*);
- **Менеджмент** (напрамкі «Міжнародны менеджмент», «Інавацыйны менеджмент», кваліфікацыя *«Менеджар-эканаміст»*);
- **Эканамічная бяспека** (кваліфікацыя *«Эканаміст»*).

На пачатку навучання ўсе студэнты атрымліваюць фундаментальную эканамічную, фінансавую і інструментальную падрыхтоўку. Эканамічная падрыхтоўка заключаецца ў вывучэнні макра-, мікра-, міжнароднай, рэгіянальнай эканомікі. Фінансавыя аспекты вывучаюцца ў разрэзе бухгалтарскага ўліку і аўдыту, карпаратыўных фінансаў, бізнес-планавання, інвестыцыйнага аналізу. Інструментальная падрыхтоўка мае на ўвазе вывучэнне матэматыкі, інфарматыкі, базы даных, статыстыкі, эканаметрыкі, метадаў прыняцця рашэнняў і лагістыкі.

**МІЖНАРОДНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ**

На эканамічным факультэце шмат увагі надаецца вывучэнню англійскай мовы, у тым ліку і прафесійна арыентаванай бізнес-англійскай мовы, аднак зацікаўленыя могуць вывучаць і іншыя мовы нашых важных гандлёвых партнёраў, напрыклад, на спецыяльнасці «Эканамічная тэорыя» ёсць магчымасць вывучаць кітайскую мову. Многія студэнты навучаюцца адзін ці два семестры за мяжой у рамках праекта «Эразмус Мундус», прымаюць удзел у сумесных праектах кшталту «Нямеччына інвестыцыі ў Беларусі» з Універсітэтам прыкладных навук (Мітвайд, ФРГ), «Беларусь – Галандыя: знешне-эканамічнае супрацоўніцтва і лагістыка» (з Інстытутам менеджменту FONTYS, Галандыя), а таксама ў праектах з універсітэтамі Літвы, Польшчы, ФРГ, Італіі, Швейцарыі, Кітая, Украіны, Расіі.

**125** усяго выкладчыкаў

**1700** студэнтаў

**16** дактароў

**53** кандыдаты навук

У рамках міжнародных праектаў прафесары эканомікі з замежных ВНУ прыязджаюць чытаць лекцыі на англійскай мове па актуальных праблемах эканомікі. Напрыклад, вялікай папулярнасцю карыстаюцца лекцыі прафесара Р. Менге з Дзюсельдорфскага ўніверсітэта па канкурэнцыі ў Еўропе.

Папулярным з'яўляецца сумесны праект з Універсітэтам прыкладных навук (Мітвайд, ФРГ) па падрыхтоўцы магістраў па спецыяльнасці Industrial Management на англійскай мове з выдачай пасля двух гадоў навучання (з якіх 3 семестры студэнты навучаюцца і праходзяць практыку ў Германіі і за нямецкую стыпендыю) двух дыпломаў: БДУ і Універсітэта Мітвайда.

**СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА**

Кожны год праводзяцца міжнародныя конкурсы і алімпіяды, так, у 2020–2021 гг. праведзены: Еўразійскі навукова-практычны студэнцкі форум «Аналітычная эканоміка і прагназаванне да 2030», Еўразійская алімпіяда па аналітычнай эканоміцы і прагназаванні, Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых навукоўцаў «Лічбавая трансфармацыя – крок у будучыню», Міжнародны конкурс стартап-праектаў Startup Heart, конкурс «Бізнес-ідэя», кейс-чэмпіянат Business Case Student Competition, Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых навукоўцаў «Банкаўскі бізнес і фінансавая эканоміка: глабальныя трэнды і перспектывы развіцця», конкурс па фінансавай дасведчанасці школьнікаў «Фінансавая дасведчанасць пакалення Z». Таксама працягвае сваю дзейнасць адукацыйны праект для школьнікаў «Фінансавая дасведчанасць школьнікаў» «Фінансавая дасведчанасць пакалення Z» і «Школа прадпрымальніцтва пакалення Z». У тым ліку быў запушчаны праект «Сумесная класная гадзіна», які прадугледжвае правядзенне практычных заняткаў па фінансавай дасведчанасці для школьнікаў Рэспублікі Беларусь ад выкладчыкаў эканамічнага факультэта.

Студэнты неаднаразова перамагалі ў міжнародных алімпіядах і конкурсах, такіх як «Бітва банкіраў СНД», чэмпіянат па карпаратыўных фінансах МДУ Growth Driver, міжнародны калядны хакатон, міжнародны бізнес-хакатон Baltic Sea Digital Event, Міжнародная алімпіяда па фінансавай бяспецы ў г. Сочы, конкурс інавацыйных праектаў і стартапаў «Патэнцыял будучыні» ў рамках міжнароднага моладзевага навуковага форуму «Ламаносаў» у МДУ імя М. В. Ламаносава. На факультэце амаль пры кожнай выпускаючай кафедры існуюць навуковыя гурткі і студэнцкія навуковыя лабараторыі.

На замову шэрагу кампаній, банкаў, прадпрыемстваў студэнты займаюцца навуковай практычнай працай у галіне бізнес-планавання, кансалтынгу, электроннага бізнесу, маркетынгу, лагістыкі. Мы маем уласныя карпункты часопісаў «Вестник Ассоциации белорусских банков», «Банкаўскі веснік», «Финансы, учет, аудит», «Новая экономика», « Экономика», у якіх студэнты друкуюць свае артыкулы.

**ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ**

Добра падрыхтаваныя эканамісты запатрабаваныя, але мы ставім задачу дапамагчы нашым выхаванцам знайсці цікавую і высокааплатную працу. Высокі працэнт выпускнікоў спецыяльнасці «Эканамічная інфарматыка» знайшлі месца працы ў фірмах Парка высокіх тэхналогій, напрыклад, у «ЭПАМ Сістэмз».

Аналітычныя ці стратэгічныя ўпраўленні вядомых, як правіла, замежных фірмаў і банкаў зацікаўлены ў выпускніках з кваліфікацыяй «Эканаміст-аналітык». Традыцыйна выпускнікі спецыяльнасці «Фінансы і крэдыт» ідуць працаваць у «БелВЭБ», «Белаграпрамбанк», «Альфабанк», «МТБанк», «Беларусбанк», «Эрнст энд Янг», Civitta, Dana Holdings, Altoros, КПМГ, Deutsche Bank, Bank of England і многія іншыя кампаніі.

***Дэвіз факультэта: «Традыцыі будучыні закладваюцца сёння».***

## Водгукі выпускнікоў



**Антон ДЗМІТРЫЕЎ, выпускнік эканамічнага факультэта 2007 года. Заснавальнік і CEO інвестыцыйнай кампаніі Quattro Capital.**

– Эканамічны факультэт адбыўся як цэнтр эканамічнай адукацыі ў рамках універсітэта, навучанне на нашым факультэце стала «знакам якасці», свайго роду дыпломам Гарварда ці Оксфарда, але абароненым у Беларусі. Часткай паспяховага будучага факультэта становяцца яго бесперапыннае ўзаемадзеянне і ўнёсак у працэс стварэння сучаснай і тэхналагічнай эканомікі Беларусі.



**Лаша АКУБАРДЗІЯ, выпускнік эканамічнага факультэта 2010 года. Генеральны дырэктар «Беларускага народнага банка».**

– Мая праца звязана са статыстыкай, аналітыкай, аўтаматызацыяй збору даных, што мне заўсёды падабалася. Навучанне ў БДУ сапраўды дапамагло ўладкавацца на працу, бо першым этапам пры адборы кандыдатаў быў тэст, які я не змог бы прайсці без ведаў, атрыманых ва ўніверсітэце. Тут сам працэс навучання вельмі цікавы, і ты атрымліваеш задавальненне ад вучобы.



**Дзмітрый ЦІМАФІЕВІЧ, выпускнік эканамічнага факультэта 2014 года. Дырэктар Унітарнага прадпрыемства «Прайсвотэрхаус Куперс Эшуранс», PwC у Беларусі**

– Менавіта на эканамічным факультэце, акрамя магутнай тэарэтычнай базы, вялікая ўвага надаецца практычным аспектам, а сама вучоба і разнастайнасць навучальных дысцыплін дапамагаюць абраць напрамак, які быў бы цікавым у плане прафесійнага развіцця. Факультэт дае студэнтам не толькі магчымасць атрымліваць веды, але і праяўляць сябе ў стартап-праектах, удзельнічаць у міжнародных канферэнцыях, што павышае прафесійны ўзровень будучага спецыяліста.

# Юрыдычны факультэт







Дэкан – кандыдат юрыдычных навук дацэнт
Андрэй Віктаравіч ШЫДЛОЎСКІ

Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 8

Тэл. 209-52-30

E-mail: law@bsu.by

www.law.bsu.by

## Юрыдычны факультэт БДУ – гэта прэстыж, творчасць, будучыня, фундаментальныя веды, выдатная прафесійная падрыхтоўка!



У структуры факультэта 12 кафедраў, цэнтр адукацыйных інавацый, аддзел «Юрыдычная клініка», вучэбная лабараторыя крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз. На юрыдычным факультэце функцыянуюць адзіныя кафедры ў Беларусі – кафедра экалагічнага і аграрнага права, а таксама кафедра права інтэлектуальнай уласнасці.

Фонд бібліятэкі юрфака складае каля 150 тыс. выданняў, у тым ліку каля 4 тыс. унікальных і рэдкіх выданняў.

**240** усяго выкладчыкаў

**2357** студэнтаў

**1** член-карэспандэнт

**22** дактары

**155** кандыдатаў навук

### СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Падрыхтоўка на юрыдычным факультэце вядзецца па наступных спецыяльнасцях:

- **«Правазнаўства»**. Кваліфікацыя *«Юрыст»*.
- **«Эканамічнае права»**. Кваліфікацыя *«Юрыст з веданнем эканомікі»*.
- **«Паліталогія»**. Кваліфікацыя *«Палітолаг-юрыст»*.

Студэнты юрыдычнага факультэта спецыялізуюцца па 9 напрамках: арганізацыя і дзейнасць дзяржаўных органаў, гаспадарчае права, судова-пракурорска-следчая дзейнасць, адвакатура і натарыят, падатковае і банкаўскае права, прававое забеспячэнне камерцыйнай дзейнасці, прававое рэгуляванне фінансаў і крэдыту, палітыка і дзяржаўнае кіраванне. Развіваецца кірунак лічбавых тэхналогій у праве і заканадаўстве.

Адукацыйны працэс спалучае класічную форму выкладання з новымі тэхналогіямі вышэйшай школы. Юрыдычны факультэт забяспечаны сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, інфармацыйнымі і інфармацыйна-прававымі сістэмамі. Прафесійныя навыкі студэнты набываюць на лекцыях, семінарскіх і практычных занятках, вучэбных і вытворчых практыках.

### МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У цяперашні час асноўнымі замежнымі партнёрамі факультэта выступаюць Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт, Расійская дзяржаўная акадэмія інтэлектуальнай уласнасці, Саратаўская дзяржаўная юрыдычная акадэмія, юрыдычны інстытут Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў, Маскоўскі дзяржаўны юрыдычны ўніверсітэт (МДЮА) імя А. Я. Кутафіна, Маскоўскі ўніверсітэт МУС Расіі імя В. Я. Кікоця, Інстытут Луі Фаваро Універсітэта Экс-Марсель, Кіеўскі ўніверсітэт права, Кубанскі дзяржаўны ўніверсітэт, Патсдамскі ўніверсітэт, Кіеўскі нацыянальны універсітэт імя Тараса Шаўчэнкі, Саратаўскі нацыянальны даследчы дзяржаўны ўніверсітэт імя М. Г. Чарнышэўскага, Казахскі нацыянальны ўніверсітэт імя аль-Фарабі, Малдаўскі дзяржаўны ўніверсітэт, Філіпс універсітэт г. Марбург, Нацыянальны юрыдычны ўніверсітэт імя Я. Мудрага.

Асноўнымі напрамкамі міжнароднага супрацоўніцтва з'яўляюцца запрашэнне замежных выкладчыкаў для чытання лекцый і правядзення семінараў па найбольш актуальных пытаннях прававой навукі і практыкі, а таксама арганізацыя міжнароднай навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў з удзелам прадстаўнікоў замежных дзяржаў.

### СТУДЭНЦКАЕ САМАКІРАВАННЕ

Студэнцкае самакіраванне на юрыдычным факультэце налічвае 7 органаў і арганізацый, аб'яднаных у студэнцкі савет факультэта: ПА ГА «БРСМ», прафбюро студэнтаў, савет старастаў, маладзевы сектар на юрыдычным факультэце ГА «Саюз юрыстаў», студэнцкі саюз, студэнцкі савет па якасці адукацыі, творчы саюз. Жыццё студэнтаў на юрыдычным факультэце напоўнена спартыўнымі і творчымі падзеямі. На факультэце выдаецца студэнцкая газета «Востаў ЮФ».

На базе музея правазнаўства працуе гісторыка-патрыятычны цэнтр «Памяць».

Набыць практычныя навыкі юрыста студэнты таксама могуць у аддзеле «Юрыдычная клініка» цэнтра адукацыйных інавацый факультэта. Гэта структурнае падраздзяленне, якое займаецца навучаннем студэнтаў практычным навыкам юрыста праз ажыццяўленне імі бясплатнага прававога інфармавання і кансультавання малазабяспечаных і сацыяльна неабароненых катэгорый грамадзян пад кіраўніцтвам выкладчыкаў-куратараў. Юрыдычная клініка таксама супрацоўнічае з агульнаадукацыйнымі навучальнымі ўстановамі Беларусі ў межах напрамку «Права на кожны дзень».

### СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА

На факультэце створаны ўсе ўмовы для адукацыйнай, навуковай дзейнасці і рэалізацыі творчых здольнасцяў студэнтаў. Праводзяцца студэнцкія навуковыя канферэнцыі, конкурсы навуковых работ, дыялогавыя пляцоўкі, на кафедрах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь на базе факультэта штогод праводзіцца Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда, пераможцы якой уключаюцца ў спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі факультэта працуюць на прадпрыемствах усіх формаў уласнасці, адвакатуры, натарыяце, у судовай сістэме, у праваахоўных органах, у заканадаўчых і выканаўчых органах улады. Сярод выпускнікоў – кіраўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, міністры, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі ўстаноў і арганізацый, выбітныя адвакаты і юрысты. Нашы выпускнікі ўзначальваюць Канстытуцыйны і Вярхоўны суды, Генеральную пракуратуру, Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў, Эканамічны суд СНД, Рэспубліканскую калегію адвакатаў, Саюз пісьменнікаў Беларусі, грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў» і інш.

## Водгукі выпускнікоў



**Вольга ЧУПРЫС, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

– Універсітэт – гэта студэнты, ад якіх заўсёды атрымліваеш пэўны зарад энергіі. Хочацца, каб наша моладзь прагнула ведаў, была актыўнай у грамадскім, навуковым і спартыўным жыцці ўніверсітэта. БДУ валодае вялікімі магчымасцямі і ўмовамі для самарэалізацыі кожнага студэнта, але толькі пры асабістым жаданні і намаганнях самога навучэнца. БДУ ў свой юбілейны перыяд выступае моцным лідарам па многіх паказчыках сярод рэспубліканскіх і замежных універсітэтаў. Хацелася б, каб ён і далей развіваўся, прырастаў добрымі студэнтамі, каб дружны калектыў не шкадаваў сваіх магчымасцяў і сіл.



**Цімур Валер'евіч СЫСУЕЎ, кіраўнічы партнёр, адвакат юрыдычнай фірмы «Сысуеў, Бондар і партнёры ЭсБіЭйч» (SBH Law offices).**

– Адукацыя, якую дае юрфак БДУ, універсальная. З аднаго боку, гэта вузкапрафесійная, «рамесніцкая» – у добрым сэнсе – падрыхтоўка, якая дазваляе практыкаваць права, г. зн. працаваць адвакатам або памочнікам адваката, юрыстам у карпаратыўным сектары, працаваць у судах, натарыяце, органах юстыцыі, праваахоўных органах і г. д. Аднак падрыхтоўка юрфака дае значна больш магчымасцяў: выпускнік юрфака можа быць кім заўгодна і працаваць дзе заўгодна. Многія нашы выпускнікі з'яўляюцца паспяховымі бізнесменамі, працуюць топ-менеджарамі буйных беларускіх і замежных кампаній, на кіраўнічых пасадах у дзяржаўным апараце, у міжнародных арганізацыях і г. д. Найлепшыя выпускнікі юрфака ўмеюць думаць, аналізаваць, прымаць рашэнні, вучыцца, пастаянна пазнаваць новае і працаваць над сабой. Юрфак дае навыкі, неабходныя для поспеху.

# Інстытут бізнесу БДУ

В. а. дырэктара – кандыдат юрыдычных навук дацэнт Валерый Віктаравіч МАНКЕВІЧ

Адрас: г. Мінск, вул. Шпалерная, 7

Тэл. 350-00-20

E-mail: mail@sbmt.by

www.sb.bsu.by







Інстытут бізнесу БДУ – гэта:
– 50+ адукацыйных праграм
– 25+ гадоў на рынку бізнес-адукацыі
– 3500+ студэнтаў і слухачоў штогод
– 60+ замежных партнёраў
– 40+ студэнцкіх мерапрыемстваў штогод

Структура Інстытута ўключае 7 кафедраў. Адукацыйны працэс забяспечваюць 6 дактароў, 60 кандыдатаў навук, больш за 50 бізнестрэнераў. Большасць выкладчыкаў прайшла спецыяльную падрыхтоўку ці стажыроўку за мяжой у рамках сумесных міжнародных адукацыйных праектаў.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

- **«Бізнес-адміністраванне»** (кваліфікацыя – *«Менеджар-эканаміст»*).
- **«Лагістыка»** (кваліфікацыя – *«Лагістык-эканаміст»*).
- **«Маркетынг»** (кваліфікацыя – *«Маркетолаг-эканаміст»*).
- **«Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі»** (кваліфікацыя – *«Менеджар-эканаміст інфармацыйных сістэм»*).

На ўсіх спецыяльнасцях ёсць магчымасць навучання на рускай або англійскай мовах.

Дадзеныя спецыяльнасці сёння з'яўляюцца найбольш запатрабаванымі ва ўмовах пераходу да інавацыйнай эканомікі. Спецыяльнасці прадугледжваюць сфарміраванасць светапогляду і валоданне выпускніком кампетэнцыямі, якія грунтуюцца на глыбокім разуменні рынкавай эканомікі, функцый і эканамічнай ролі дзяржавы, усведамленні сацыяльнай адказнасці бізнесу. Падрыхтоўка ў Інстытуце бізнесу БДУ разлічана на тых, хто плануе прэтэндаваць на кіраўнічыя пасады ў бізнесе.

Вялікая ўвага надаецца вывучэнню англійскай мовы, якая з'яўляецца не толькі праграмнай дысцыплінай, але і мовай выкладання ўсіх курсаў.

Формы атрымання адукацыі: вочная і завочная.

Сярод устаноў вышэйшай адукацыі Інстытут бізнесу БДУ стаў першай і адзінай у краіне, хто атрымаў міжнародную акрэдытацыю якасці бізнес-адукацыі IQA (International Quality accreditation) прэстыжнай Еўрапейскай асацыяцыі развіцця менеджменту CEEMAN. Яна пацвярджае, што матэрыяльная і вучэбная база, выкладчыцкі калектыў, адукацыйныя праграмы і якасць адукацыі адпавядае ўсім еўрапейскім стандартам.

Трэці год запар інстытут прызнаны найлепшым у намінацыі «Адукацыя» ў міжнароднай прэміі «Лідар года».

Інстытут бізнесу БДУ стаў лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Найлепшы экспарцёр года–2020».

**МАГІСТАРСКІЯ ПРАГРАМЫ**

Інстытут бізнесу БДУ рэалізуе 14 магістарскіх праграм (на праграмах MBA, «Тэхналогіі кіравання персаналам» і «Фінансавы менеджмент» навучанне магчымае як на рускай, так і на англійскай мове). З 1996 г. у Інстытуце бізнесу БДУ рэалізуецца праграма па падрыхтоўцы магістраў бізнесадміністравання (праграма MBA). Паводле ацэнкі міжнароднай экзаменацыйнай камісіі, узровень ведаў выпускнікоў праграмы MBA Інстытута бізнесу БДУ адпавядае стандартам якасці прэстыжных заходніх універсітэтаў.

**117** усяго выкладчыкаў
**3500+** студэнтаў
**6** дактароў
**60** кандыдатаў навук

**ПЕРАПАДРЫХТОЎКА І ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ**

Інстытут бізнесу БДУ запрашае асоб з вышэйшай адукацыяй і студэнтаў старэйшых курсаў на перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі па розных напрамках: кіраванне, фінансы, лагістыка, маркетынг, дызайн, праграмаванне, англійская мова, права, экалогія.

**МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ**

Інстытут бізнесу БДУ мае партнёрскія зносіны з многімі еўрапейскімі ўніверсітэтамі, актыўна ўдзельнічае ў разнастайных міжнародных праектах. Найлепшыя студэнты маюць магчымасць стажыравацца ў Стакгольмскай школе эканомікі ў Рызе (Латвія), Універсітэце менеджменту і эканомікі (Літва), праходзіць практыку ў буйных замежных кампаніях і інш.

З 2014 г. Інстытут пачаў падрыхтоўку па спецыяльнасці *«Бізнес-адміністраванне»* на англійскай мове, з 2019 г. па спецыяльнасці *«Маркетынг»*, з 2020 – *«Лагістыка»*, а з 2021 года навучанне праводзіцца на англійскай мове па спецыяльнасці *«Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі»*. На дадзеных спецыяльнасцях сёння навучаюцца студэнты з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Азербайджана, Нігерыі, Індыі, Туркменістана, Сірыі, Сербіі, Мазамбіка, Лівіі, Лівана, Бангладэш, Канады, Арменіі, Гамбіі, Італіі, Камеруна, Кітая, Конга, Кот-д'Івуара, Літвы, Латвіі, Турцыі, Узбекістана, Францыі, Эквадора.

У студэнтаў спецыяльнасці «Лагістыка» ёсць магчымасць атрымаць двайны беларуска-фінскі дыплом спецыяліста па лагістыцы. Магчымасць атрымання дыплома прадстаўляе Універсітэт прыкладных навук паўночна-ўсходняй Фінляндыі, дзе студэнты навучаюцца на працягу 2 семестраў.

**СІСТЭМА IT-РЭСУРСАЎ**

Інстытут бізнесу БДУ займае лідарскія пазіцыі сярод устаноў вышэйшай адукацыі па выкарыстанні тэхналогій электроннага навучання.

Сістэма IT-рэсурсаў інстытута ўключае:

- рэйтынгавую сістэму ацэнкі ведаў уласнай распрацоўкі інстытута;
- навучальны партал (сістэма электроннага навучання Moodle, электронная бібліятэка, аўтарскія курсы з магчымасцю замацавання і кантролю ведаў,сістэма зносін выкладчыкаў і студэнтаў – круглыя сталы і форумы);
- рэсурсы для правядзення заняткаў і кансультацый у анлайн-фармаце;
- мабільнае прыкладанне «Расклад» уласнай распрацоўкі.

**ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ**

Інстытут надае вялікую ўвагу планаванню будучай кар'еры студэнтаў і праводзіць пошук месцаў вытворчай і пераддыпломнай практык, арганізуе сустрэчы з прадстаўнікамі кампаній і паспяховымі выпускнікамі, ладзіць трэнінгі. Усё забяспечвае цэнтр адукацыі і кар'еры, які функцыянуе ў Інстытуце бізнесу БДУ.

Выпускнікі Інстытута бізнесу БДУ працуюць менеджарамі, эканамістамі, маркетолагамі, фінансавымі і сістэмнымі аналітыкамі, менеджарамі па ўкараненні ІТтэхналогій і сістэм, бізнескансультантамі, менеджарамі праектаў, праекціроўшчыкамі ІТсістэм, лагістыкамі, спецыялістамі па кіраванні перавозкамі, спецыялістамі па закупках і інш. Многія з выпускнікоў і студэнтаў пачынаюць свой бізнес падчас вучобы, з'яўляюцца кіраўнікамі прадпрыемстваў.

***Інстытут бізнесу БДУ – мы рыхтуем лідараў!***

## Водгукі выпускнікоў



**Вікторыя ДАЙНЯК, выпускніца 2021 года (вочная форма навучання), бізнес-аналітык / project manager «ДзювасХоладАўта».**

– Паступіўшы ў Інстытут бізнесу БДУ, я ні разу не засумнявалася ў сваім выбары! Тут я сустрэла неверагодна сяброўскі калектыў і навучылася працаваць у камандзе, тут самыя лепшыя і кваліфікаваныя выкладчыкі, якія ставяцца да ўсіх студэнтаў як да родных дзяцей, тут праводзяць самыя вясёлыя мерапрыемствы, тут пануе ўнікальная атмасфера і кожны дзень як свята!

У Інстытуце бізнесу БДУ я даведалася, што ўніверсітэт – гэта не толькі вучоба і бяссонныя ночы перад сесіяй, а яшчэ развіццё сябе як асобы, сваёй мэтанакіраванасці і ўменняў выходзіць з зоны камфорту.

Дзякуй дарагому калектыву майго ўлюбёнага ўніверсітэта, гэтыя цудоўныя гады назаўсёды застануцца ў маёй памяці!



**Юлія КЛЯПАЦКАЯ, выпускніца 2021 (вочная форма навучання), маркетолаг у ТАА «Сем гісторый».**

– Вучоба ў Інстытуце бізнесу БДУ – гэта магчымасць авалодаць асновамі і навыкамі прафесіі, той, пра якую ты марыў яшчэ ў школе, а праз 4 гады студэнцкага жыцця ты з дыпломам аб вышэйшай адукацыі і багажом ведаў ад самых лепшых выкладчыкаў.

Дзякуючы штогадовым практыкам у кампаніях, у мяне з'явілася агульнае разуменне, з чым можна сутыкнуцца ў рэальных умовах. А на практычных занятках не толькі агульныя заданні, але і твой асабісты аргументаваны выбар плюс дапамога і слушныя парады ад выкладчыкаў.

Велізарная колькасць творчай актыўнасці заўжды будуць грэць маю душу і выклікаць усмешку на твары.

Алімпіяды, навуковыя канферэнцыі – тое, што жадаю паспрабаваць кожнаму студэнту.

Дарэчы, атрыманне зніжкі – гэта рэальна, праверана асабіста!

Дзякуй, Інстытут бізнесу БДУ, за найлепшыя 4 гады навучання і выдатных людзей!

# Інстытут дадатковай адукацыі



Дырэктар-дэкан – кандыдат філалагічных навук Павел Іванавіч НАВОЙЧЫК

Адрас: г. Мінск, вул. Акадэмічная, 25

Тэл. 259-73-33

E-mail: fpuedu@bsu.by

www.fpuedu.bsu.by

## ІДА – твой першы крок ва ўніверсітэт і арыенцір у свеце прафесій будучыні!

**67** усяго выкладчыкаў

**718** слухачоў

**15** кандыдатаў навук

ІДА вырашае задачы па прафесійнай арыентацыі моладзі, падрыхтоўцы яе да паступлення ў ВНУ, адаптацыі замежных грамадзян да навучання ў Беларусі, а таксама перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі на базе вышэйшай адукацыі.

Факультэт мае 3 камп'ютарныя класы, 6 аўдыторый, абсталяваных інтэрактыўнымі мультымедыйнымі панэлямі, бібліятэку з фондам літаратуры для абітурыентаў больш за 20 тысяч асобнікаў.

Асноўныя напрамкі дзейнасці ІДА:
- падрыхтоўчае аддзяленне для беларускіх грамадзян,
- падрыхтоўчае аддзяленне для замежных грамадзян,
- падрыхтоўчыя курсы,
- перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі.

### ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ГРАМАДЗЯН

Асноўная мэта – падрыхтоўка будучых абітурыентаў да цэнтралізаванага тэсціравання і паспяховай здачы ўступных экзаменаў на ўсе спецыяльнасці БДУ і іншых УВА. Вядзецца падрыхтоўка па наступных профілях: інфармацыйныя тэхналогіі, фізічны, матэматычны, хімічны, геаграфічны, біялагічны, гістарычны, эканамічны, філасофскі, сацыялагічны, культуралагічны, а таксама праваЗнаўства, моваЗнаўства, літаратуразнаўства, замежныя мовы, журналістыка, псіхалогія, сацыяльная абарона, міжнародныя адносіны, культура і мастацтва.

На працягу вучэбнага года на падрыхтоўчым аддзяленні тыднёвая нагрузка складае да 24 акадэмічных гадзін. Форма навучання – дзённая.

Вучэбныя планы ўключаюць: рускую або беларускую мову і два або тры профільныя прадметы. Агульны аб'ём вучэбнага плана ў сярэднім складае 712 акадэмічных гадзін.

Вучэбныя праграмы ўсіх дысцыплін складзены з улікам паглыблення, сістэматызацыі і абагульнення ведаў, атрыманых вучнямі ў сярэдняй школе. Пра эфектыўнасць працы падрыхтоўчага аддзялення сведчаць вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, паказаныя нашымі выпускнікамі 2020 і 2021 гг.: па кожным прадмеце вынікі палепшаны ў сярэднім на 15–20 балаў, больш за 90 % выпускнікоў сталі студэнтамі ўстаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Навучэнцы маюць магчымасць прымаць удзел ва ўніверсітэцкім праекце «Студэнт на тыдзень», для іх арганізуюцца сустрэчы з вядучымі супрацоўнікамі ўніверсітэта, наведванне навуковых лабараторый і музеяў БДУ.

Навучэнцы падрыхтоўчых аддзяленняў для беларускіх і замежных грамадзян разам удзельнічаюць у культурна-масавых мерапрыемствах, напрыклад, «Малыя алімпійскія гульні», «Давайце пазнаёмімся», «Новы год па-беларуску», «Новы год па ўсходнім календары », «Міс інстытута», «Містар інстытута». Ладзяцца сустрэчы з першакурснікамі – выпускнікамі аддзялення.

Для паступлення на падрыхтоўчае аддзяленне патрэбны: заява на імя рэктара, дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), сертыфікаты ЦТ, 3 фотаздымкі 3х4, медыцынская даведка зацверджанага ўзору. Калі ў абітурыента няма сертыфіката ЦТ па першым профільным прадмеце, то праводзіцца ўступны экзамен у форме тэсціравання.

Навучанне на аддзяленні платнае. Іншагароднім даецца інтэрнат.

Тэл.: 259-73-29, 272-00-08.

### ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ДЛЯ ЗАМЕЖНЫХ ГРАМАДЗЯН

Асноўная мэта – фарміраванне ў замежных слухачоў маўленчых кампетэнцый на рускай мове ў асноўных відах камунікатыўнай дзейнасці для падрыхтоўкі замежных грамадзян да далейшага навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама іх сацыякультурнай адаптацыі да студэнцкага жыцця ў Беларусі.

Даўніверсітэцкая падрыхтоўка замежных грамадзян у БДУ мае працяглую гісторыю і грунтуецца на прынцыпах высокай якасці навучання і дапамогі замежным слухачам. За ўвесь час тут навучалася звыш 11 тыс. слухачоў з 122 краін.

Навучанне адбываецца па наступных профілях: гуманітарны, эканамічны, хімікабіялагічны, фізіка-матэматычны. З навучэнцамі працуюць вопытныя і кампетэнтныя выкладчыкі, якія выкарыстоўваюць найноўшыя дасягненні метадычнай навукі, у тым ліку сучасныя інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі.

Тэрмін навучання на падрыхтоўчым аддзяленні для замежных грамадзян складае 10 месяцаў з тыднёвай нагрузкай 36 акадэмічных гадзін. У структуры вучэбнага плана ў аб'ёме 1040 акадэмічных гадзін: руская мова (800 гадзін), два профільныя прадметы (240 гадзін).

Форма навучання – дзённая, навучанне платнае. Па выніках станоўча здадзеных экзаменаў замежныя грамадзяне атрымліваюць пасведчанне, якое дае ім права быць залічанымі як у БДУ, так і ў іншыя ўстановы вышэйшай адукацыі Беларусі.

Пры падрыхтоўчым аддзяленні працуюць таксама курсы рускай мовы па розных праграмах з аб'ёмам ад 80 да 720 гадзін.

У чэрвені–жніўні дзейнічае летняя школа рускай мовы з рознымі праграмамі навучання працягласцю ад 4 да 10 тыдняў.

Для паступлення замежным грамадзянам трэба падаць: запрашэнне на навучанне, заяву на імя рэктара, пашпарт з візай, дакумент аб адукацыі, медыцынскую страхоўку.

Тэл.: +375 17 259-73-31, +375 17 259-73-32, +375 17 259-73-33.

### ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

Курсы розныя па формах (дзённыя, вячэрнія, завочныя (з выкарыстаннем інфармацыйных камп'ютарных тэхналогій)) і тэрмінах навучання (ад 2 да 8 месяцаў) дзейнічаюць на працягу ўсяго навучальнага года. У чэрвені–ліпені працуюць экспрэскурсы (3–10 дзён). Заняткі па ўсіх дысцыплінах праводзяцца як у групах камплектнасцю 10–12 слухачоў, так і ў групах малой камплектнасці (5–8 слухачоў), а таксама ў групах індывідуальнай падрыхтоўкі (да 3 слухачоў). У залежнасці ад формы навучання і камплектнасці груп у тыдзень на прадмет адводзіцца 2 ці 3 акадэмічныя гадзіны.

Пералік вучэбных прадметаў, а таксама кошт навучання ўдакладняецца напярэдадні пачатку набору слухачоў.

Навучанне вядуць выкладчыкі ІДА, а таксама іншых факультэтаў БДУ і ўстаноў адукацыі Мінска, якія маюць вялікі вопыт работы ў галіне даўніверсітэцкай адукацыі. Пра эфектыўнасць падрыхтоўчых курсаў гаворыць той факт, што каля 85 % абітурыентаў, якія закончылі курсы і ўдзельнічалі ў конкурсе, сталі студэнтамі БДУ, а астатнія – студэнтамі іншых універсітэтаў і каледжаў.

Тэл.: 259-73-29, 272-00-08, 272-50-18.

З мэтай эфектыўнай падрыхтоўкі абітурыентаў да цэнтралізаванага тэсціравання сумесна з РІКВ з кастрычніка па красавік праводзяцца 3 этапы рэпетыцыйнага тэсціравання. Апрацоўка бланкаў адказаў ажыццяўляецца па тэхналогіі ЦТ.

Тэл.: 272-50-18.

### ФАКУЛЬТЭТ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ І ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ

Прапануе шмат праграм, заняткі на якіх дазволяць стаць паспяховым спецыялістам у сучасных кірунках развіцця эканомікі нашай краіны.

## Водгукі выпускнікоў



**Герман СУШКЕВІЧ, студэнт факультэта міжнародных адносін БДУ, выпускнік падрыхтоўчага аддзялення для беларускіх грамадзян ІДА 2021 года.**

– Вучоба ў ІДА дапамагла мне ўмацаваць і папоўніць неабходныя веды для паспяховай здачы выпрабаванняў у ходзе цэнтралізаванага тэсціравання, дзякуючы чаму я паступіў на той факультэт БДУ, на які планаваў.

Шчыра ўдзячны выкладчыкам і кіраўніцтву ІДА за тое, што не толькі далі неабходныя веды для паступлення, але, так бы мовіць, адаптавалі за час вучобы да ўніверсітэцкіх патрабаванняў.

Заўсёды з асаблівай цеплынёй буду ўспамінаць вучобу на падрыхтоўчым аддзяленні ІДА, таму што яна стала яшчэ адной прыступкай да сталення, як кажуць, пуцёўкай у дарослае жыццё.



**Хэ Ліцзюань, аспірантка Інстытута бізнесу БДУ, выпускніца ФДА ІГ ІДА 2021 года.**

– У працэсе навучання на ФДА я ператварылася са студэнткі, якая ведала толькі некалькі рускіх літар, у аспірантку, якая цяпер добра разумее змест заняткаў.

Я сумую па розных конкурсах, у якіх удзельнічала пад кіраўніцтвам Ірыны, экскурсіях па Мінску ў кампаніі Насці.

Я ўдзячная кожнаму выкладчыку за нястомнасць у перадачы нам ведаў.

# Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ

Рэктар – Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі

Адрас: г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 24

Тэл. 379-64-33

E-mail: theology@bsu.by

www.theology.bsu.by





## Інстытут тэалогіі вядзе падрыхтоўку ўнікальных спецыялістаў у галіне міжканфесійнага дыялогу, развівае міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы тэалагічнай адукацыі

У структуры інстытута тры кафедры: багаслоўя, біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння, рэлігіязнаўства. Дзейнічае навучальная літургічная лабараторыя. Больш за 69 % выкладчыкаў інстытута маюць навуковыя ступені і званні.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ ажыццяўляе падрыхтоўку па спецыяльнасці **«Тэалогія»** з прысваеннем кваліфікацыі *«Тэолаг-рэлігіявед. Выкладчык грамадазнаўчых дысцыплін»*. Нашы выпускнікі маюць магчымасць альбо працягваць навучанне ў магістратуры і аспірантуры, альбо працаваць выкладчыкамі курса «Рэлігіязнаўства» і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, а таксама новага школьнага факультатыва па духоўнасці і патрыятызме. Высокі ўзровень падрыхтоўкі дазваляе ім таксама паспяхова працаваць у сферы навукі, культуры, царкоўнага і сацыяльнага служэння.

**ДЫСЦЫПЛІНЫ**

Студэнты вывучаюць 5 моў: чатыры старажытныя (старажытнаяўрэйскую, старажытнагрэчаскую, лацінскую, царкоўнаславянскую) і адну сучасную (англійскую, нямецкую ці французскую). У цыкле спецыяльных дысцыплін вывучаюцца Свяшчэннае Пісанне Старога і Новага Запаветаў, біблейская археалогія, багаслоўе (асноўнае, параўнальнае, дагматычнае, маральнае), літургіка, патралогія, агульная гісторыя хрысціянскай царквы, кананічнае права, гістарычнае рэлігіязнаўства, сектазнаўства, сістэматычнае рэлігіязнаўства, рэлігійная філасофія, візанталогія, псіхалогія рэлігіі, сацыялогія рэлігіі, гісторыя Рускай праваслаўнай царквы, гісторыя хрысціянства ў Беларусі.

**БІБЛІЯТЭЧНЫ ФОНД**

У бібліятэцы інстытута назапашаны ўнікальны фонд навуковай літаратуры па багаслоўскіх, царкоўна-гістарычных, рэлігіязнаўчых і рэлігійна-філасофскіх дысцыплінах. Бібліятэчны фонд і фонд электронных рэсурсаў уключае больш чым 21 тысячу назваў (27 тысяч адзінак захавання).



33 усяго выкладчыкаў

121 студэнтаў

2 дактары

21 кандыдат навук

**СТУДЭНЦКАЯ НАВУКА**

Інстытут тэалогіі ўзаемадзейнічае з прыходамі Беларускай праваслаўнай царквы, з аднаго боку, і ўстановамі адукацыі – з іншага. Штогод на базе інстытута праводзяцца Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні і міжнародная студэнцкая навуковая канферэнцыя «Хрысціянскія каштоўнасці ў культуры сучаснай моладзі», у якіх бяруць удзел школьнікі і студэнты не толькі Беларусі, але і краін блізкага замежжа. Навучэнцы старэйшых класаў могуць прыняць удзел і ў конкурсе даследчых і творчых прац «Святло Праваслаўя», тэматыка якіх прымеркавана да юбілейных дат і памятных падзей у гісторыі роднай краіны.

Сістэматычна ў інстытуце праводзяцца сустрэчы студэнтаў з дактарамі багаслоўя, кандыдатамі філасофскіх навук, прадстаўнікамі сферы мастацтва. Таксама на базе інстытута створана дыскусійная пляцоўка «Рэлігіязнаўчы кінаклуб „Рэлігія і кіно“», арганізавана дзейнасць студэнцкай навуковай даследчай лабараторыі «Нетрадыцыйная рэлігійнасць у Беларусі».

У Інстытуце тэалогіі дзейнічае маладзевы праект «Асветніцкі лекторый», мэтай якога з'яўляецца духоўна-маральная і прафарыентацыйная дзейнасць.

У мастацкай галерэі інстытута можна пазнаёміцца з творамі таленавітых мастакоў і іканапісцаў. Ёсць і музей Бібліі, у якім захоўваюцца выданні і пераклады Бібліі на розныя мовы свету. Дасведчаныя экскурсаводы распавядуць пра кожны экспанат, прадэманструюць чытанне на царкоўнаславянскай, лацінскай і іншых мовах.

**СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ**

Студэнты яшчэ падчас свайго навучання спрабуюць сябе ў якасці выкладчыкаў у нядзельных школах праваслаўных прыходаў Мінска, праходзяць педагагічную практыку ва ўстановах адукацыі сталіцы. Кожны можа ўдзельнічаць і ў грамадскай дзейнасці інстытута, якая прадстаўлена сукупнасцю разнастайных маладзевых праектаў, такіх як студэнцкі лялечны тэатр «Батлейка»; хор Інстытута тэалогіі БДУ; добраахвотніцкае аб'яднанне «Элеас»; асветніцкі выязны лекторый. Адукацыйныя экскурсіі па святых і гістарычных месцах, паломніцкія паездкі, студэнцкія лагеры і іншыя мерапрыемствы, якія спрыяюць развіццю далягляду студэнта, фарміруюць яго маральную і грамадзянскую пазіцыю, з'яўляюцца пастаяннай і неад'емнай часткай жыцця кожнага, хто пераступіць парог Інстытута тэалогіі.

**ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ**

Выпускнікі Інстытута тэалогіі працаўладкоўваюцца ў навучальныя ўстановы, рэлігійныя аб'яднанні, грамадскія арганізацыі, турыстычныя фірмы (рэлігійны турызм), СМІ, выдавецтвы, навукова-даследчыя цэнтры, бібліятэчныя цэнтры.

Гэта, без сумнення, унікальная навучальная ўстанова валодае ўсімі якасцямі для таго, каб стаць alma mater для выдатных спецыялістаў, якія сумяшчаюць прафесіяналізм і актыўную жыццёвую пазіцыю.

## Водгукі выпускнікоў



**Святар Святаслаў РАГАЛЬСКІ, старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Хрысціянскі адукацыйны цэнтр імя святых Мяфодзія і Кірыла». Выпускнік 2000 года, дыплом з адзнакай. Кандыдат багаслоўя (2003), дацэнт Інстытута тэалогіі БДУ і Мінскай духоўнай акадэміі. Скончыў аспірантуру НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь», суіскальнік ступені кандыдата педагагічных навук.**

– Для мяне адукацыя ў Інстытуце тэалогіі (тады яшчэ на факультэце) стала вызначальнай у жыцці, я карыстаюся ёй кожную хвіліну сваёй дзейнасці і служэння. Увесь час пераконваюся, што я атрымаў менавіта тую адукацыю, якую хацеў і якая дазваляе зразумець, што ў жыцці ты займаешся менавіта тым, на што вучыўся, калі твая дзейнасць успрымаецца не як праца, якая забірае сілы, а як улюбёны занятак, што прыносіць радасць як табе, так і тым, дзеля каго ты працуеш.



**Кацярына СТРОЙЛАВА, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, аспірант РІВШ. Найлепшы выпускнік БДУ 2017 г.**

– Інстытут тэалогіі БДУ рыхтуе выдатных спецыялістаў у галіне філасофскай антрапалогіі, тэалогіі і рэлігіязнаўства. Дадзенага ўзроўню ведаў студэнты могуць дасягнуць дзякуючы навучальнай праграме, якая складаецца з дысцыплін багаслоўскага, рэлігіязнаўчага, філасофскага, гістарычнага характару. Студэнты маюць магчымасць удзельнічаць у розных навуковых канферэнцыях, а таксама ў конкурсах навуковых і літаратурных работ на духоўна-маральную тэматыку.

# Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ













Дырэктар – доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Сяргей Аляксандравіч МАСКЕВІЧ

Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23/1

Тэл. 317-99-93

E-mail: fpuedu@bsu.by

www.fpuedu.bsu.by

**Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ з'яўляецца базавай ВНУ экалагічнага профілю ў дзяржавах-удзельніцах СНД. Навучанне спецыялістаў І ступені вышэйшай адукацыі вядзецца на двух факультэтах па 7 спецыяльнасцях. На базе факультэтаў ажыццяўляецца падрыхтоўка магістрантаў і аспірантаў.**

**217** усяго выкладчыкаў
**1788** студэнты
**1** член-карэспандэнт
**24** дактары
**89** кандыдатаў навук

Асноўнымі задачамі МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ з'яўляюцца:

1. Забеспячэнне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі, экалагічны кантроль і маніторынг навакольнага асяроддзя. Праектаванне і распрацоўка праграмнага забеспячэння для сістэм апрацоўкі інфармацыі ў экалогіі і ахове здароўя, асвойванне складанага медыцынскага абсталявання.

2. Ацэнка рызыкі, у тым ліку радыяцыйнай, здароўю насельніцтва. Даследаванні ў галіне біяхіміі, генетыкі, імуналогіі; клінікалабараторная дыягностыка.

**ФАКУЛЬТЭТ МАНІТОРЫНГУ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ**
**Дэкан – кандыдат хімічных навук дацэнт Вячаслаў Уладзіміравіч ЖЫЛКО.**
**Адрас: г. Мінск, вул. Батанічная, 15.**
**Тэл. 396-71-77.**

У склад факультэта ўваходзяць 6 кафедраў: інфармацыйных тэхналогій у экалогіі і медыцыне; экалагічнага маніторынгу і менеджменту; энергаэфектыўных тэхналогій; ядзернай і радыяцыйнай бяспекі; агульнай і медыцынскай фізікі; сацыяльна-гуманітарных навук і ўстойлівага развіцця.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў, звязаных з вырашэннем праблем ахоны навакольнага асяроддзя, выкарыстаннем і распрацоўкай інфармацыйных тэхналогій у экалогіі і медыцыне, правядзеннем экалагічнага маніторынгу, прагназаваннем змен навакольнага асяроддзя пад уздзеяннем антрапагенных і прыродных фактараў, экалагічным аўдытам прадпрыемстваў, тэхнічным забеспячэннем работы ўстаноў аховы здароўя.

Выпускнікі факультэта маюць шырокія магчымасці для працаўладкавання ва ўстановах НАН Беларусі, РУП «Беларуская атамная электрастанцыя», Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава» і інш. Выпускнікі факультэта добра зарэкамендавалі сябе і па-за межамі нашай краіны.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

- **«Прыродаахоўная дзейнасць»,** напрамкі спецыяльнасці «Экалагічны менеджмент і экспертыза» і «Экалагічны маніторынг». Кваліфікацыя *«Эколаг. Інжынер па ахове навакольнага асяроддзя».*
- **«Энергаэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент».** Кваліфікацыя *«Інжынер-энергаменеджар».*
- **«Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі».** Напрамак спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у экалогіі)», кваліфікацыя *«Інжынер-праграміст-эколаг».* Напрамак спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у ахове здароўя)», кваліфікацыя *«Інжынер-праграміст».*
- **«Ядзерная і радыяцыйная бяспека»,** кваліфікацыя *«Інжынер».*
- **«Медыцынская фізіка»,** кваліфікацыя *«Медыцынскі фізік».*

**ФАКУЛЬТЭТ ЭКАЛАГІЧНАЙ МЕДЫЦЫНЫ**
**Дэкан – кандыдат хімічных навук дацэнт Аляксей Рыгоравіч СЫСА.**
**Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23/1. Тэл. 379-93-59.**

У склад увходзяць 6 кафедраў: экалагічнай хіміі і біяхіміі; імуналогіі; экалагічнай медыцыны і радыебіялогіі; агульнай біялогіі і генетыкі; лінгвістычных дысцыплін і міжкультурных камунікацый; фізічнага выхавання.

Факультэт рыхтуе студэнтаў для вывучэння і ацэнкі ўздзеяння фактараў знешняга асяроддзя бія- і абіягеннага паходжання на стан клетак, тканак, органаў і ўсіх сістэм арганізма (сардэчна-сасудзістай, нервовай, эндакрыннай, імуннай і інш.). Іх навучаюць метадам дыягностыкі розных відаў паталогіі, эфектыўнасці лячэння (імунакарэкцыі, скрынінгу імунарэактыўных прэпаратаў), пошуку малекулярных маркёраў уздзеяння на арганізм экалагічных фактараў, малекулярных маркёраў паталагічных працэсаў, а таксама ўсяму спектру сучасных клініка-дыягнастычных метадаў.

Навучэнцы факультэта праходзяць выдатную практычную падрыхтоўку не толькі ў лабараторыях інстытута, аснашчаных сучасным абсталяваннем, але і на базе клінік, клінічных і навукова-даследчых лабараторый, у інстытутах НАН Беларусі, у клінічных і навуковадаследчых інстытутах Міністэрства аховы здароўя і іншых арганізацыях і ўстановах як медыка-прафілактычнага, так і лячэбнага профілю.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

- **«Медыка-біялагічная справа»,** кваліфікацыя *«Біёлаг-аналітык. Выкладчык біялогіі».* Спецыялізацыі – «Цыталогія», «Біяхімія», «Імуналогія».
- **«Медыцынская экалогія»,** кваліфікацыя *«Эколаг-эксперт».* Спецыялізацыі – «Эпідэміялогія», «Радыебіялогія», «Імуналогія».

МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ супрацоўнічае з міжнароднымі грамадскімі арганізацыямі і вядучымі беларускімі і замежнымі адукацыйнымі цэнтрамі. Студэнты інстытута прымаюць удзел у міжнародных навукова-даследчых праектах і маюць магчымасць стажыравацца ў замежных універсітэтах. Ажыццяўляецца студэнцкі абмен у рамках вучэбных праграм з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі іншых краін.

## Водгукі выпускнікоў



**Дар'я НІЖАГАРОДАВА, узначальвае аддзел імуналогіі і біямедыцынскіх тэхналогій навукова-даследчай лабараторыі БелМАПА. Выпускніца 2003 г. спецыяльнасці «Радыебіялогія і радыяцыйная медыцына» са спецыялізацыяй «імуналогія».**

– Ганаруся тым, што атрымала вышэйшую адукацыю ў Сахараўскім універсітэце. Для рэалізацыі свайго навуковага патэнцыялу мне былі даступныя ўсе перадавыя магчымасці на той час: высокакваліфікаваныя выкладчыкі, высокатэхналагічнае ўнікальнае абсталяванне, вытворчыя практыкі ў профільных навукова-практычных цэнтрах. Асабліва хачу падкрэсліць, што і ў той час, калі я была студэнткай, і цяпер МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ застаецца адзінай вышэйшай навучальнай установай у Рэспубліцы Беларусь, якая выпускае прафесіяналаў-імунолагаў.



**Таццяна ГОЛУБ, працуе кансультантам упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Выпускніца 2010 года, спецыяльнасць «Экалагічны маніторынг, менеджмент і аўдыт», цяпер пераўтворана ў спецыяльнасць «Прыродаахоўная дзейнасць».**

– Я вельмі рада, што выбрала экалагічную сферу дзейнасці. Мне пашанцавала з калектывам выкладчыкаў, і ў працы вельмі спатрэбіліся веды ў сферы экалагічнага заканадаўства і абыходжання з адходамі. Гэта вельмі дынамічная галіна ведаў, якая вымушае быць у курсе ўсіх змен. Таму пазней я скончыла і магістратуру па спецыяльнасці «Экалогія (тэхнічныя навукі)», што дапамагло мне пры распрацоўцы нарматыўных прававых актаў, у тым ліку тэхнічных нарматыўных прававых актаў, якія закранаюць пытанні абыходжання з адходамі, а таксама зніжэння выкарыстання поліэтыленавай упакоўкі.

Дырэктар – кандыдат біялагічных навук дацэнт Ганна Сяргееўна ЧУБАРАВА

Адрас: г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8

Тэл. 209-52-65

E-mail: lyceum@bsu.by

www.lyceum.by

# Ліцэй БДУ













Ліцэй БДУ – гэта адзінаццаць профіляў навучання: філалагічны, гісторыка-грамадазнаўчы, гуманітарны, лінгвістычны, біялагічны, хімічны, матэматычны, эканамічны, фізічны, інфарматыка-матэматычны і адзіны ў краіне інфарматыка-фізічны профіль

**528** ліцэістаў

**100** усяго выкладчыкаў

**31** кандыдат навук

**10** настаўнікаў-метадыстаў

**72** настаўнікі вышэйшай катэгорыі

Ліцэй БДУ заснаваны ў 1989 г. з мэтай навучання і выхавання таленавітай моладзі.

Працуе 10 кафедраў – метадычных аб'яднанняў. Больш за 30 супрацоўнікаў ліцэя – яго выпускнікі.

**ПАСТУПЛЕННЕ**

Каб паступіць у Ліцэй БДУ, трэба мець высокі ўзровень падрыхтоўкі, бо сярэдні конкурс штогод складае каля 7 чалавек на месца – толькі 264 з прыблізна 2000 абітурыентаў залічваюць у 10 клас ліцэя. Для паступлення ў Ліцэй БДУ выпускнікам 9 класаў неабходна прайсці два іспыты па прадметах, якія адпавядаюць абранаму профілю. Абітурыенты з большай сумай па двух іспытах рэкамендуюцца да залічэння. Без экзаменаў у Ліцэй БДУ паступаюць пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах – адпаведна з профілем навучання.

**ПАДРЫХТОЎКА ДА ІСПЫТАЎ**

Сёння ў абітурыентаў ёсць нямала магчымасцяў падрыхтавацца: дзякуючы дапаможнікам для паступлення ў ліцэй, на падрыхтоўчых курсах «Вечаровы Ліцэй» (кожны год тут вучыцца больш за 700 абітурыентаў), на серверы дыстанцыйнага навучання ліцэя (e-lyceum.bsu.by), дзе існуе цэлы раздзел, разлічаны на абітурыентаў. Тэсты-трэнажоры для тых, хто паступае ў ліцэй, – яшчэ адна магчымасць для падрыхтоўкі. Іх можа выканаць любы школьнік Беларусі на серверы дыстанцыйнага навучання (elyceum.bsu.by). Тэст адбываецца анлайн, і таму вынікі вядомыя адразу пасля яго выканання. Можна ўбачыць свае памылкі і тлумачэнне, як трэба было выканаць заданне правільна. Аплаціць тэсты-трэнажоры можна ў інтэрнэт-краме ліцэя (shop.lyceum.by) у раздзеле «электронныя рэсурсы».

**АЛІМПІЯДНЫ РУХ**

Ліцэй БДУ прымае актыўны ўдзел у рэспубліканскім і міжнародным алімпіядным руху. За 31 год ліцэісты заваявалі больш за 1750 дыпломаў рэспубліканскай алімпіяды, у 2021 годзе гэты паказчык склаў 62 дыпломы. На міжнародных алімпіядах школьнікаў ліцэісты заваявалі больш за 230 медалёў.

Штогод навучэнцы ўдзельнічаюць у Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе; Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы; Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе сярод дзяўчат; Алімпіядзе Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі па рускай мове; Рэспубліканскім конкурсе даследчых работ вучняў і г. д. Міжнародныя і рэспубліканскія турніры юных фізікаў і матэматыкаў таксама заўсёды ў полі ўвагі Ліцэя БДУ. Кожны год поспехі навучэнцаў і настаўнікаў ліцэя адзначае спецфонд Прэзідэнта Беларусі.

У Ліцэі БДУ важнае месца займае падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання. Штогод нашы выпускнікі маюць вельмі высокі сярэдні бал па ЦТ. Не ў апошнюю чаргу гэта звязана з тым, што ў Ліцэі БДУ праводзяцца дадатковыя заняткі для 11-х класаў па падрыхтоўцы да ЦТ. Для таго, каб іх наведваць, не абавязкова вучыцца ў ліцэі, дастаткова запісацца на падрыхтоўчыя курсы, у тым ліку і анлайн. Працуе сервер дыстанцыйнага навучання (e-lyceum.bsu.by).

**ЛІЦЭЙСКАЕ ЖЫЦЦЁ**

Чацвёртую частку вучняў ліцэя складаюць іншагароднія ліцэісты, якім даецца месца ў інтэрнаце № 2 БДУ.

Сярод самых значных мерапрыемстваў: пасвячэнне ў ліцэісты «Салют, карапузы!», спартыўна-аздараўленчая «Турсцяжынка», яркія і запамінальныя прэзентацыі класаў – «Візітоўкі», «Улазіны» – наваселле ў інтэрнаце са шчодрым частаваннем дранікамі. Адной з самых яркіх года з'яўляецца Дзень нараджэння ліцэя. За тры дні святкавання праводзіцца вялікая колькасць мерапрыемстваў: навукова-практычная канферэнцыя «Першы крок у навуку», і святочны канцэрт, і вечар сустрэчы выпускнікоў, і спартыўнае свята. Апошні званок – гэта смачнае марожанае з салодкім водарам дзяцінства і футбольны матч з выкладчыкамі.

Шмат гадоў у ліцэі існуюць каманды па «Што? Дзе? Калі?» і «Дэбатах», якія неаднойчы станавіліся пераможцамі рэспубліканскіх і міжнародных турніраў.

## Водгукі выпускнікоў



**Аляксей БАШАН, намеснік начальніка Акадэміі ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, палкоўнік, кандыдат юрыдычных навук. Выпускнік 1992 г.**

– Ліцэй – добрая стартавая пляцоўка. Тут вы звыкаецеся быць адказнымі, звыкаецеся працаваць. У выніку трэба па-новаму глядзець на свет, з'яўляецца жаданне адпавядаць высокім стандартам. Адчуваеш гонар за тое, што вучыўся тут. У Ліцэі не было нічога неадольнага, калі табе цікава, то і працэс навучання ідзе намнога лягчэй. Але самае галоўнае ў ліцэі – гэта людзі, з якімі цябе яднае моцная шматгадовая сувязь. Ліцэйская атмасфера дапамагае знаходзіць у сабе патэнцыял заўсёды рухацца наперад і ніколі не спыняцца.



**Андрэй ІВАНЕЦ, галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук, намеснік дырэктара Інстытута неарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук, старшыня савета маладых навукоўцаў, доктар хімічных навук. Выпускнік 2001 г.**

– У Ліцэі мяне ад самага пачатку вельмі ўразілі адносіны настаўнікаў да сваіх вучняў, вельмі паважлівыя і ветлівыя. Да нас ставіліся як да калег і заўсёды звярталіся на «вы». Ад самага пачатку я вельмі актыўна заняўся падрыхтоўкай да алімпіяды і пабачыў, што тут створана такая атмасфера і магчымасці, што кожны вучань, незалежна ад яго стартавага ўзроўню ведаў, пры неабходным старанні можа дасягнуць высокіх вяршыняў. Настаўнікі вельмі ў гэтым дапамагалі, але ў той жа час заўсёды стымулявалі нашу самастойную працу, творчую актыўнасць і даследчыцкую дзейнасць.

Самі ліцэісты гавораць, што «ліцэй – гэта другі дом», «сям'я», «ліцэй – гэта назаўсёды». Проста прыходзьце да нас, і ўбачыце ўсё на ўласныя вочы!

# Юрыдычны каледж БДУ








Дырэктар – кандыдат юрыдычных навук Алег Міхайлавіч СТАРАВОЙТАЎ

Адрас: г. Мінск, вул. Камсамольская, 21

Тэл. 397-12-82

E-mail: college@bsu.by

www.lawcollege.bsu.by

**Юрыдычны каледж БДУ пачаў сваю дзейнасць 1 верасня 2000 г. у якасці першай у краіне профільнай установы, якая забяспечвае атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці «Правазнаўства»**



За 21 год дзейнасці каледж стаў адной з найбольш прэстыжных устаноў краіны. Высокі ўзровень падрыхтоўкі ў Юрыдычным каледжы пацвярджаецца і поспехамі нашых былых навучэнцаў у прафесіі (ёсць сярод іх суддзі, намеснікі пракурораў, кіраўнікі арганізацыйна-кадравых службаў і інш.), і поспехамі ў вучобе (болей за 90 % нашых навучэнцаў працягваюць адукацыю ў беларускіх ВНУ), і дасягненнямі ў даследчай дзейнасці: два навучэнцы абаранілі кандыдацкія дысертацыі, трыццаць два – з'яўляюцца лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адоранай моладзі.

**53** усяго выкладчыкаў

**427** навучэнцаў

**6** кандыдатаў навук

**7** настаўнікаў вышэйшай катэгорыі

### СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па наступных спецыялізацыях: «Дзяржаўна-прававая дзейнасць», «Судова-прававая дзейнасць», «Гаспадарча-прававая і кадравая работа». Выпускнікам даецца кваліфікацыя *«Юрыст»*.

### АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС

Навучанне ў каледжы ажыццяўляецца па вучэбных планах і праграмах, якія даюць паглыбленую гуманітарную і спецыяльную падрыхтоўку, а таксама адпаведныя практычныя навыкі.

Адукацыйны працэс забяспечваюць шэсць цыклавых камісій: агульна-прававых дысцыплін, дзяржаўна-прававых дысцыплін, грамадзянскаправавых дысцыплін, сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, прыродазнаўчых дысцыплін, матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій. Дзейнічае аддзяленне па падрыхтоўцы на аснове агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі (дзённая форма навучання).

Функцыянуюць тры камп'ютарныя класы, а таксама лабараторыя заканадаўства, бібліятэка і чытальная зала з вялікім выбарам найноўшай юрыдычнай літаратуры.

Выпускнікі каледжа маюць права працягваць навучанне па спецыяльнасці на юрыдычным факультэце БДУ і ў іншых установах вышэйшай адукацыі са скарочаным тэрмінам навучання.

### АКРАМЯ ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАЎ

Навучэнцы ўдзельнічаюць у алімпіядах па агульна-адукацыйных прадметах і прававых дысцыплінах, навуковых канферэнцыях, семінарах і творчых конкурсах.

Навучэнцы бяруць удзел у спецыяльным праекце «Юрыст: ад ведаў да практыкі», які праводзіцца часопісам «Юрыст». Па выніках тэсціравання ўдзельнікаў выхаванцы каледжа ўваходзяць у дзясятку найлепшых.

Для самавызначэння будучых юрыстаў ладзяцца сустрэчы з навукоўцамі і юрыстамі-практыкамі, судовыя пасяджэнні на базе каледжа, экскурсіі ў вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і суды.

Жыццё навучэнцаў каледжа напоўнена не толькі вучэбнымі заняткамі і кніжнай мудрасцю. Выхаванцы прымаюць самы актыўны ўдзел у спартыўным і культурным жыцці.

Добрай традыцыяй стала правядзенне «Дзён каледжа»: выкладчыкам уручаюць узнагароды ў розных намінацыях, праводзіцца спартыўны вечар (баскетбол, валейбол, футбол), інтэлектуальны турнір «Што? Дзе? Калі?»; рыхтуецца выстава насценгазет першакурснікаў «Дазвольце павіταцца…», дзень самакіравання, выстава-кірмаш «Горад майстроў», пасвячэнне ў першакурснікі.

Традыцыйнымі сталі конкурсы: «Лэдзі каледж», «Найлепшая група каледжа», «Златавуст», тэатральна-лінгвістычны «Omnes lingvae», круглагадовая спартакіяда і інш.

### ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Нашы выпускнікі запатрабаваныя ў:

– органах судовай улады (канцылярыя, статыстыка, архіў, забеспячэнне судовай вытворчасці);

– органах прымусовага выканання судовых пастаноў;

– органах унутраных спраў (канцылярыя, служба аховы грамадскага парадку, крымінальная міліцыя, дзяжурная частка);

– юрыдычных (прававых), кадравых, рэферэнцкіх службах суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці, некамерцыйных юрыдычных асоб (грамадскія арганізацыі, прафесійныя саюзы і г. д.);

– органах пракуратуры (канцылярыя, статыстыка, архіў і г. д.);

– адвакатуры, натарыяце;

– органах сацыяльнай абароны.

Асноўныя арганізацыі-заказчыкі кадраў – Міністэрства юстыцыі Беларусі, Мінскі гарадскі суд, упраўленні ўнутраных спраў Мінгарвыканкама і Мінаблвыканкама, Эканамічны суд г. Мінска.

Юркаледж рыхтуе кваліфікаваных юрыстаў, якія спалучаюць глыбокія тэарэтычныя веды з уменнем іх практычнага ўвасаблення.

### ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПРЫЁМЕ Ў 2022 г.

(Спецыяльнасць **«Правазнаўства»**)

На аснове агульнай базавай адукацыі (9 кл.): тэрмін навучання – 2 гады 10 месяцаў (дзённая форма). Залічэнне ажыццяўляецца па конкурсе сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыі.

На аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 кл.): тэрмін навучання – 1 год 10 месяцаў (дзённая форма). Залічэнне ажыццяўляецца па суме балаў сертыфікатаў ЦТ (беларуская (руская) мова, грамадазнаўства) і сярэдняга бала дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі.

## Водгукі выпускнікоў



**Вераніка ШЫЛАК, юрыст ТАА «Юрыдычная кампанія ЮКОН».**

– Каледж стаў маёй другой сям'ёй. У нас былі вясёлыя студэнты і найлепшыя выкладчыкі. Пасля каледжа навучэнцы валодаюць усімі неабходнымі ведамі для пачатку працы.

Самае прыемнае ў каледжы было тое, што навучальныя працэсы разбаўляюць цікавымі мерапрыемствамі. Каледж дапамог многім маім сябрам знайсці сваё месца ў жыцці, пры гэтым не ўсе працуюць юрыстамі. Аднак усім дапамагаюць у жыцці атрыманыя веды. Зараз я працую ў кампаніі, дзе працаўладкавана 6 выпускнікоў нашага каледжа, і мы заўсёды з цеплынёй успамінаем праведзеныя ў ім гады.



**Паліна АНТОНЕНКА, юрысконсульт міжнароднай юрыдычнай фірмы GRATA International BY.**

– Юрыдычны каледж – гэта мая alma mater, якая дала не толькі веды, але і бясцэнны вопыт у самаразвіцці і самаўдасканаленні. Я ўпэўнена, што званне найлепшай сярэдняй спецыяльнай установы краіны – не пустыя словы. Гэта вынік згуртаванай працы ўсяго выкладчыцкага калектыву, назапашанага вопыту і традыцый.

Выпускнікі каледжа заўсёды запатрабаваны наймальнікамі, бо праходжанне гэтай «школы жыцця» азначае высокі ўзровень не толькі тэарэтычных ведаў, але і практычных навыкаў, якіх часам не стае выпускнікам ВНУ. Акрамя таго, у каледжы моцна развіта сістэма студэнцкага самакіравання. Вопыт кіравання саветам навучэнцаў дапамог мне ў юным узросце сфарміраваць лідарскія якасці, што бясспрэчна дапамагае дасягаць пастаўленых асабістых і прафесійных мэт.

Навучанне ў Юрыдычным каледжы БДУ – адзін з самых шчаслівых перыядаў у маім жыцці.

# Сумесны інстытут БДУ і Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта (Кітай)




Дырэктар – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Ігар Анатольевіч САЛАДУХІН

Адрас: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4, к. 103

Тэл. 209-56-29, 209-56-54

E-mail: jointinstit@gmail.com

www.bsu.by







Сумесны інстытут
БДУ-ДПУ (СІБД) – гэта:
1-ы сумесны беларуска-кітайскі інстытут,
2 дыпломы (БДУ, ДПУ),
3 мовы (руская, англійская, кітайская),
4 гады навучання.

Сумесны інстытут пачаў сваю дзейнасць 1 верасня 2019 г. Яго адкрыццё з'яўляецца яшчэ адным крокам да пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ў сферы адукацыі і навукі.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

- **«Фізіка (вытворчая дзейнасць)».** Кваліфікацыя спецыяліста – *«Фізік-інжынер»*.
- **«Механіка і матэматычнае мадэляванне».** Кваліфікацыя спецыяліста – *«Механік. Матэматык-прыкладнік»*.
- **«Сусветная эканоміка»**. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Эканаміст»*.

Спецыяльнасці, па якіх адбываецца набор абітурыентаў у СІБД, з'яўляюцца актуальнымі і запатрабаванымі ва ўсім свеце, адпавядаюць сучасным тэндэнцыям развіцця эканомікі, навукі і тэхналогій.

Студэнты СІБД маюць магчымасць атрымаць сучасныя веды па сваёй спецыяльнасці, удасканаліць валоданне англійскай мовай, засвоіць базавы курс кітайскай мовы. Міжнародныя стажыроўкі, а таксама супрацоўніцтва з Кітайскабеларускім індустрыяльным паркам «Вялікі камень» дазволяць студэнтам стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі міжнароднага ўзроўню.

Адукацыйны працэс па кожнай са спецыяльнасцяў забяспечваюць выкладчыкі наступных факультэтаў БДУ: фізічнага, механіка-матэматычнага і факультэта міжнародных адносін, а таксама Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта. Большасць выкладчыкаў займаецца навуковымі даследаваннямі і неаднаразова праходзілі стажыроўку за мяжою у рамках сумесных міжнародных адукацыйных і навуковых праектаў.

**78** выкладчыкаў
**150** навучэнцаў
**41** кандыдат навук
**6** дактароў

**ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ**

У будучых спецыялістах зацікаўлены арганізацыі, якія займаюцца пытаннямі міжнароднага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і КНР, а таксама камерцыйныя арганізацыі і прадпрыемствы, у тым ліку сумесныя беларуска-кітайскія кампаніі.

Сярод патэнцыяльных месцаў працаўладкавання: кампаніі-рэзідэнты Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» («СЕТС кітайская электратэхніка», «Інавацыі інтэлекту», «Бел Хуавэй Тэхналаджыс» і інш.), а таксама Парка высокіх тэхналогій (EPAM Systems, IBA IT Park, Itransition і інш.). Ужо заключаны шэраг дамоў, якія прадугледжваюць размеркаванне выпускнікоў. Магчымае працаўладкаванне ў ДПУ, розныя кампаніі і арганізацыі Кітая.

**АДРАС ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ БДУ**

**Мінск, вул. Ленінградская, 16, кабінет 112.**

**Даведкі па тэл.:**
**+375 17 209-50-85 (шматканальны).**

**Уся інфармацыя, што датычыцца паступлення ў БДУ, размешчана на сайце: www.abiturient.bsu.by**

## ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ДЗЁН АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

### Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на 2021/2022 навучальны год

| Факультэт | Дата, час | Фармат правядзення* | Тэлефон |
|---|---|---|---|
| БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ | 30 сакавіка 2022, 12-00 | вочна | 209-59-00 |
| ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ | 12 лютага 2022, 10-00 | вочна | 209-52-82 |
| ФАКУЛЬТЭТ ГЕАГРАФІІ І ГЕАІНФАРМАТЫКІ | 30 сакавіка 2022, 10-00 | анлайн | 209-55-84 |
| ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ | 29 сакавіка 2022, 11-00 | вочна | 259-70-98 |
| ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ | 30 сакавіка 2022, 11-00<br>31 сакавіка 2022, 11-00 | вочна<br>гарачая лінія | 360-09-14 |
| МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ | 30 сакавіка 2022, 12-30 | змяшаны | 209-52-48 |
| ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН | 2 лютага 2022, 13-00 | вочна | 209-57-72 |
| ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ | 2 лютага 2022, 13-00 | анлайн | 209-50-70 |
| ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ | 27 сакавіка 2022, 11-00 | вочна | 209-58-36 |
| ФАКУЛЬТЭТ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ | 28 сакавіка 2022, 12-00 | вочна | 209-59-09 |
| ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК | 31 сакавіка 2022, 11-00<br>з 21 сакавіка 2022 па 4 красавіка 2022 | вочна<br>анлайн-форум | 259-74-06 |

| Факультэт | Дата, час | Фармат правядзення | Тэлефон |
|---|---|---|---|
| ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ | 2 лютага 2022, 12-00 | вочна | 209-50-67 |
| ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ | 31 сакавіка 2022, 11-00 | змяшаны | 249-13-65 |
| ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ | 26 сакавіка 2022, 14-00 | вочна | 209-55-16 |
| ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ | 2 лютага 2022 | змяшаны | 374-39-96 |
| ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ | 31 лютага 2022, 11-00 | змяшаны | 209-50-19 |
| ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ | 30 сакавіка 2022, 19-00 | анлайн | + 375 29 704-05-34 |
| ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА | 29 сакавіка 2022, 15-00 | вочна | 379-63-67 |
| МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА | 1 красавіка 2022, 12-00 | анлайн | 396-71-77 |
| ІНСТЫТУТ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ | 1 красавіка 2022, 14-00 | гарачая лінія | 395-00-14 |
| ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ | 31 сакавіка 2022, 10-00 | змяшаны | 370-55-22 |
| ЛІЦЭЙ | апошні тыдзень сакавіка 2022 | анлайн | 209-56-04 |

*Фармат правядзення мерапрыемства можа мяняцца ў залежнасці ад эпідэміялагічнай сітуацыі

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 04.02.2022 г.
Зак. 93. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*